ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 39 (2399)
20 мая 1969 г.
АУТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

МЫ — НА ВЕНЕРЫ!..

130 дзён праз чорную бездань касмічнай прасторы ляцелі дзве аўтаматычныя станцыі, створаныя талентам савецкіх людзей. 350 мільёнаў кіламетраў — вось даўжыня шляху, які пераадолелі «Венера-5» і «Венера-6».

І вось палёт закончаны. Напэўна гэта было цудоўнае відовішча, калі апарат «Венера-5», разгойдваючыся на стропах агромністых парашутаў, прабіўся праз хмарнае покрыва венерыянскай атмасферы і павольна апусціўся на паверхню таямнічай планеты.

А праз дзень «Венера-6» паўтарыла гэты складаны манёўр.

Аўтаматычныя станцыі выканалі вялікую праграму навуковых даследаванняў. З дапамогай прыбораў, устаноўленых на борце аўтаматычных станцый, праводзіўся шырокі комплекс даследаванняў фізічных працэсаў у космасе, тэмпературы, ціску і хімічнага саставу нашай бліжэйшай суседкі ў Сусвеце — Венеры.

Станцыі даставілі на Венеру вымпел з Дзяржаўным гербам Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і барэльефам Уладзіміра Ільіча Леніна.

Такім чынам савецкай навукай і тэхнікай упісана яшчэ адна слаўная старонка ў гісторыю асваення касмічнай прасторы, і сёння мы з упэўненасцю можам сказаць — праграма Савецкага Саюза па даследаванні касмічнай прасторы і планет сонечнай сістэмы паспяхова выконваецца.

ДНІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ВА ЎЛЬЯНАЎСКУ

ПАД ЗНАКАМ БРАТЭРСТВА

Пісьменнікі А. Вялюгін, М. Ткачоў і С. Грахоўскі — госці Ульянаўскага сельскагаспадарчага інстытута.

Саліст Беларускай дзяржаўнай філармоніі С. Машкоў сярод аматараў музыкі пасёлка Акцябрскі Чардаклінскага раёна.

Артыстка Дзяржаўнага народнага аркестра БССР Валянціна Шаблоўская са сваімі новымі сябрамі.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ (БЕЛТА).

Беларускія спевакі Ю. Смірноў і М. Пушкароў і кампазітар Ул. Алоўнікаў (ля раяля) выступаюць перад рабочымі Ульянаўскага маторабудаўнічага завода.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

У цэнтры Ульянаўска ўзводзіцца манументальны помнік Ільічу — Ленінскі мемарыяльны цэнтр. Ён будуецца якраз на тым месцы, дзе нарадзіўся і калісьці жыў У. І. Ленін. Гэта будзе самы велічны, самы прыгожы будынак Ульянаўска. У ім размесцяцца Ульянаўскі філіял Цэнтральнага музея У. І. Леніна, Дом палітычнай асветы, канцэртная зала на 1400 месц. Самым урачыстым месцам у мемарыяльным комплексе будзе Ленінская зала, упрыгожаная скульптурнымі групамі, мазаічнымі пано, маляўнічымі фрэскамі.

Дэлегацыя Беларусі на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёвым наведала будаўніцтва гэтага велічнага помніка. Гасцей сардэчна вітаў сакратар парткома будоўлі І. К. Цімошкін. Ён правёў членаў дэлегацыі па будаўнічай пляцоўцы, расказаў аб ходзе работ.

Дэлегацыя Беларускай рэспублікі наведала таксама Ульянаўскі завод цяжкіх унікальных станкоў. Члены дэлегацыі пазнаёміліся з дзейнасцю завода, яго перспектывамі. Адбыліся цёплыя гутаркі з рабочымі.

На прадпрыемствах горада праходзяць канцэрты майстроў беларускага мастацтва. На Ульянаўскі маторны завод беларускія кампазітары і артысты прыйшлі ў абедзенны перапынак. Сакратар парткома прадпрыемства В. Н. Рабушкін горача вітаў гасцей, пазнаёміў іх з жыццём калектыву. Заслужаныя дзеячы мастацтваў БССР У. Алоўнікаў і Ю. Семяняка расказалі маторабудаўнікам аб музычным жыцці Беларусі, аб сваёй творчасці. Землякам Ільіча было прыемна даведацца, што ў нашай рэспубліцы створана багатая Ленініяна. Прысутныя вельмі цёпла прымалі песні нашых кампазітараў, якія выконвалі заслужаныя артысты БССР Л. Ганестава і Ю. Смірноў, артысты Л. Шубіна і М. Пушкароў.

Такая ж цёплая, задушэўная сустрэча кампазітараў і выканаўцаў адбылася з выкладчыкамі, афіцэрамі і курсантамі Ульянаўскага ваенна-тэхнічнага вучылішча імя Багдана Хмяльніцкага. Разам з работнікамі мастацтваў гасцямі воінаў былі дырэктар Інстытута філасофіі і права Акадэміі навук БССР К. П. Буслаў і праслаўленая беларуская партызанка Герой Савецкага Саюза М. Б. Осіпава.

У абласным драматычным тэатры з вялікім поспехам выступаў Дзяржаўны народны аркестр БССР (мастацкі кіраўнік народны артыст СССР І. Жыновіч). Гледачы аддалі належнае майстэрству салістаў — народнаму артысту БССР З. Бабію і лаўрэату рэспубліканскага конкурсу вакалістаў І. Адзінцовай. А ў Доме культуры Ульянаўскага машынабудаўнічага завода гледачы бурна апладзіравалі майстэрству Дзяржаўнага народнага хору БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Г. Цітовіча.

У другім па велічыні горадзе вобласці — Мелекесе ў памяшканні Дома культуры «Усход» выступала эстрадная група Белдзяржфілармоніі пры ўдзеле заслужанага артыста БССР В. Вуячыча. У раённым цэнтры Інза з вялікай канцэртнай праграмай выступіла група салістаў тэатра оперы і балета і Белдзяржфілармоніі.

■

Цікава прайшоў у зале абкома КПСС грамадскі прагляд фільмаў «Гадзіннік спыніўся апоўначы» і «Генерал Пушча», створаных студыяй «Беларусьфільм». Усіх, хто прысутнічаў на праглядзе, да глыбіні душы ўсхваляваў расказ Героя Савецкага Саюза М. Б. Осіпавай — удзельніцы справядлівага і суровага суда над катам беларускага народа гітлераўскім гаўляйтарам Кубэ.

У цэнтральным кінатэатры «Рассвет» адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю беларускіх фільмаў. Прысутныя цёпла віталі прыбыўшых на адкрыццё фестывалю намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёва, намесніка загадчыка аддзела культуры ЦК Кампартыі Беларусі Я. Б. Парватава. Гасцямі гледачоў была таксама творчая група студыі «Беларусьфільм», у якую ўваходзяць намеснік галоўнага рэдактара студыі Г. Таран, кінарэжысёр Ю. Дубровін, актрысы кіно А. Дубровіна і Л. Румянцава.

З цёплымі словамі да гасцей звярнуўся сакратар гаркома КПСС А. В. Казараў. Затым выступіў намеснік загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ Я. Б. Парватаў. Ён расказаў аб шляхах развіцця беларускага кіно, аб яго творчых планах.

У зале тухне святло. На экране з'яўляюцца цітры новага фільма студыі «Беларусьфільм» — «Дзесятая доля шляху».

Дэманстрацыя беларускіх фільмаў пачалася адначасова ў некалькіх кінатэатрах і дамах культуры горада.

У час Дзён культуры адбываюцца творчыя сустрэчы беларускіх гасцей з кінагледачамі. Экспануецца выстаўка, прысвечаная развіццю беларускага кіно.

■

Працягваюць сустрэчы з працоўнымі Ульянаўска і вобласці беларускія пісьменнікі. Яны пабывалі ўжо ў гасцях у чыгуначнікаў вузлавой станцыі Майна, сустракаліся з чытачамі бібліятэк і навучальных устаноў Ульянаўска, выступалі па мясцоваму тэлебачанню. Нашы літаратары наведалі сядзібу вядомага рускага паэта Н. М. Языкава, прыйшлі на паклон да елкі, пасаджанай тут рукамі А. С. Пушкіна ў 1833 годзе.

Цікава прайшоў літаратурны вечар у клубе вучэбнай гаспадаркі інстытута сельскай гаспадаркі, размешчаным у пасёлку Акцябрскі Чардаклінскага раёна. Беларускіх літаратараў тут сустрэлі хлебам-соллю. Сімвалічны дар урачыста паднёс ім былы баец чапаеўскай дывізіі С. І. Чумакоў.

Удзельнік баёў за вызваленне нашай рэспублікі дырэктар вучгаса А. Ф. Суготаў па-брацкуі вітаў гасцей, паднёс скульптурны партрэт У. І. Леніна. Аб развіцці беларускай літаратуры прысутным расказаў М. Ткачоў. Ён падарыў хлебаробам кнігі з творамі беларускіх пісьменнікаў. Затым свае вершы, прысвечаныя У. І. Леніну, прачыталі А. Вялюгін і С. Грахоўскі.

Беларускія пісьменнікі ўсклалі кветкі да помніка Ільіча ў пасёлку Акцябрскі, агледзелі гаспадарку вучгаса. У канцэрце, які адбыўся ў заключэнне сустрэчы, салісты Беларускай дзяржаўнай філармоніі С. Гулевіч, Е. Цвятаева і С. Машкоў выканалі рускія і беларускія народныя песні.

Старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР В. А. Грамыка і народны мастак рэспублікі В. К. Цвірко мелі некалькі творчых сустрэч у Мастацкім музеі, дзе разгорнута выстаўка твораў майстроў жывапісу, графікі і скульптуры нашай рэспублікі, пабывалі ў майстэрнях сваіх мясцовых калег.

Ульянаўскія мастакі разам са сваімі гасцямі на працягу двух дзён выязджалі на натурныя замалёўкі ў месцы, звязаныя з імем Ільіча. В. Цвірко і В. Грамыка напісалі рад эцюдаў, якія з'явяцца асновай для стварэння новых карцін. Яны прызначаюцца для папаўнення беларускай мастацкай Ленініяны.

Група майстроў мастацтваў рэспублікі дала вялікі канцэрт у цэнтры суконнай прамысловасці — горадзе Барыш. У прыгарадзе Ульянаўска — Ігнатаўцы, у Доме культуры Ульянаўскага аўтамабільнага завода выступалі Дзяржаўныя народныя хор і аркестр БССР. У памяшканні абласнога драматычнага тэатра адбыліся канцэрты эстраднай групы Беларускай дзяржаўнай філармоніі з удзелам заслужанага артыста БССР В. Вуячыча.

Восем творчых сустрэч з гледачамі правялі работнікі студыі «Беларусьфільм». Акрамя гарадскіх кінатэатраў, сустрэчы адбыліся ў дамах культуры Засвіяжскага і Заволжскага раёнаў горада. Рэжысёр Ю. Дубровін і кінаактрыса А. Дубровіна расказалі аб сваёй рабоце над новым фільмам «Дзесятая доля шляху», які затым дэманстраваўся.

Здымачная група студыі рыхтуе спецыяльны выпуск кіначасопіса «Савецкая Беларусь», прысвечанага Дням культуры Беларусі ва Ульянаўску.

■

Дэлегацыя Беларускай ССР на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёвым наведала горад Мелекес. Пасля гутаркі ў гарадскім камітэце партыі пасланцоў нашай рэспублікі запрасілі ў навукова-даследчы інстытут атамных рэактараў.

Дэлегацыя Беларускай ССР наведала таксама эксперыментальную гарадскую сярэднюю школу на 1100 вучняў.

У доме культуры навукова-даследчага інстытута адбылася задушэўная сустрэча грамадскасці горада з пасланцамі беларускага народа. З прывітальнымі прамовамі да гасцей звярнуліся першы сакратар гарадскога камітэта КПСС Г. Ф. Палноў і старшыня выканкома гарадскога Савета дэпутатаў працоўных А. Е. Ефанаў.

З вялікай увагай удзельнікі сустрэчы слухалі выступленні намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Р. Я. Кісялёва і беларускай партызанкі-падпольшчыцы Героя Савецкага Саюза М. Б. Осіпавай. У дар мелекесцам дэлегацыя Беларускай ССР паднесла партрэт народнага песняра Янкі Купалы.

А ўвечары жыхары горада бурна апладзіравалі майстэрству Дзяржаўнага народнага хору БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Г. Цітовіча.

■

Ва Ульянаўску, над прасторамі магутнай Волгі, гучаць беларускія мелодыі.

Пасля аднаго з канцэртаў Дзяржаўнага народнага хору БССР карэспандэнты БЕЛТА папрасілі старшага метадыста харавога таварыства Ульянаўскай вобласці В. Чыхалева падзяліцца сваімі ўражаннямі.

— Немагчыма выдзеліць лепшае з праграмы канцэрта, — сказаў ён. — Кожны твор быў выканан з высокім майстэрствам і пранікнёвасцю. Шырока і велічна прагучала песня беларускага кампазітара І. Лучанка «Ён нарадзіўся вясной», прысвечаная У. І. Леніну. Прыемным падарункам жыхарам нашага горада з'явілася «Песня аб Ульянаўску» І. Лучанка.

Музыкаўна ўльянаўскай філармоніі Г. Ахметава дае высокую ацэнку канцэртам майстроў мастацтваў Беларускай ССР.

— Асноўнае ўражанне, вынесенае пасля канцэрта, — сказала яна, — высокі ўзровень музычнай культуры.

— Добрае ўражанне зрабіла выступленне народнага артыста БССР І. Сарокіна. Усімі любімая руская народная песня «Из-за острова на стрежень» у яго выкананні атрымала новае, свежае вырашэнне.

— Народны артыст БССР В. Чарнабаеў бліскуча выконвае як творы класічнага рэпертуару, так і народныя песні. Імя Зіновія Бабія вядома многім слухачам. Магутнасць і прыгажосць голасу вабяць усіх.

— Пасланцы беларускага балета — народная артыстка рэспублікі Н. Давыдзенка і Е. Паўловіч — прадэманстравалі дасягненні гэтага віду мастацтва выкананнем «Па-дэ-дэ» з балета П. Чайкоўскага «Лебядзінае возера».

— Выступленні майстроў мастацтваў БССР, — сказала ў заключэнне Г. Ахметава, — паказалі росквіт духоўнай культуры брацкага беларускага народа.

Па матэрыялах БЕЛТА.

ХАЙ ПЕРАМОГУЦЬ ЛЕПШЫЯ!

АГЛЯД-КОНКУРС ФІЛЬМАЎ ЛАТВІІ, ЛІТВЫ, ЭСТОНІІ, МАЛДАВІІ І БЕЛАРУСІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Гаспадарамі другога дня работы Дзесятага занальнага кінаагляду-конкурсу былі нашы суседзі-сябры — літоўскія кінематаграфісты. У кінатэатры «Піянер» яны паказалі фільмы рэжысёра А. Арамінаса «Калі я быў маленькім» і мастацкі фільм «Пачуцці» рэжысёраў А. Дауса і А. Грынявічуса. Кінадакументалісты Літвы на конкурсны агляд прапанавалі тры карціны — «У пошуках аднаго дня», «Восем візітных картак», «...І стары, і малады», а таксама кіначасопісы «Савецкая Літва» № 31 і № 38 і аўтарскі сюжэт аператара А. Баронаса «Нараджэнне». Вільнюская студыя тэлебачання ў Доме работнікаў мастацтваў паказала фільмы «Смерць і вішнёвае дрэва», «Мост», «Буслы між іншым» і «Рытмы, рытмы».

Днём эстонскіх кінематаграфістаў на аглядзе-конкурсе было 17 мая. Хвалюючым і пранікнёным было ўступнае слова кінадраматурга Віктара Ларэнца — аўтара сцэнарыя шыракаэкраннага фільма «Вар'яцтва»:

— З глыбокай павагай ставімся мы да беларускага народа, які так мужна і самааддана адстойваў у дні Вялікай Айчыннай вайны родную зямлю. Беларусь-партызанка — так называюць вашу рэспубліку. Я ведаю, што кожны чацвёрты беларус загінуў у вайне з самай страшнай навалай дваццатага стагоддзя — фашызмам. І наш фільм, які мы прапануем сёння на суд журы і гледачоў, гэта расказ пра злачынства фашызму, што пагражаў знішчыць чалавецтва. Разгромлены на палях цяжкіх бітваў Савецкай Арміяй, фашызм узнімае галаву ў ФРГ і іншых краінах. Таму барацьба з гэтым небяспечным шаленствам і сёння актуальная і надзённая.

Рэжысёр-пастаноўшчык фільма «Вар'яцтва» Кальё Кійск расказаў, як ствараласа гэтая кінастужка:

— У рабоце над фільмам прымаў удзел вялікі творчы калектыў. Нам добра працавалася з аператарам, дзеячом беларускай кінематаграфіі Анатолем Забалоцкім. Спадзяюся, што наша творчая дружба будзе мацнець і шырыцца. Калі наш фільм выкліча ў гледачоў трывогу за лёс чалавецтва, калі ён закране ў іх струну гуманізму, мы будзем лічыць нашу задачу выкананай.

На конкурсным праглядзе дэманстраваўся таксама новы шыракаэкранны мастацкі фільм «Людзі ў салдацкіх шынялях», сцэнарый якога створаны на аснове рамана былога палітрука эстонскай дывізіі Паўля Куусберга «Другое «я» Эна Кальма». Фільм апавядае пра баявы шлях эстонскіх салдат у гады Айчыннай вайны. Рэжысёр-пастаноўшчык фільма Ю. Мююр, аператар-пастаноўшчык М. Дараватоўскі.

Эстонскія дакументалісты паказалі дакументальныя карціны «Крэпасць у моры», «Ноч на Атлантыцы», «511 лепшых фатаграфій з Марса», каляровыя лялечныя кінастужкі «Аператар Кыпс у царстве каменя», «Шасцяронка» і «Малпачка Фіпс» і два кіначасопісы.

З работ Талінскай тэлестудыі паказваліся фільмы «Мужчынам слёзы не да твару», «Наш Артур», «Эстонія», «Калі скончыцца нафта», «Цёця Роз».

Дзень малдаўскага кіно — 18 мая — пачаўся дэманстрацыяй фільма «Гэта імгненне». Падзеі ў фільме адбываюцца ў канцы 30-х гадоў. У гераічную Іспанію пад сцягі інтэрнацыянальных брыгад прыходзілі ўсе, хто лічыў сваім абавязкам абараняць Іспанскую рэспубліку ад фашызму. Былі тут байцы і з Бесарабіі. Пра Малдаўскі батальён на чале з камуністам доктарам Крысця расказваецца ў гэтай карціне. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр-пастаноўшчык Э. Лацяну, галоўны аператар В. Чура.

«Малдова-фільм» прапанавала на конкурс-агляд яшчэ адну новую мастацкую кінастужку — «Рыцар мары». Аўтары сцэнарыя В. Дзербянёў, Л. Руціцкі, рэжысёр-пастаноўшчык В. Дзербянёў. Фільм прысвечаны Аляксандру Грыну.

Журы дакументальных і навукова-папулярных фільмаў пазнаёмілася з работамі малдаўскіх кінапубліцыстаў — двума кінаальманахамі і стужкамі «Увага, дзеці», «Трынта», «Маскі нашай зімы». Кішынёўская тэлестудыя паказала фільмы «Вашым, таварыш, сэрцам і імем», «Сляды» і тэлефільм-рэпартаж «Арнамент».

Учора на конкурсе-паказе быў Дзень беларускага кіно. Былі паказаны мастацкія фільмы «Іван Макаравіч» і «Годны да нестраявой». Кінадакументалісты дэманстравалі фільмы «Штрыхі да партрэта», «Паляванне са старым сабакам», «Самазабойца» і кіначасопісы «Нас вадзіла маладосць» і «Савецкая Беларусь» № 2 (1968 г.). У Доме мастацтва паказваліся карціны Мінскай студыі тэлебачання «Зямны паклон», «Першы раз у першы клас» і «Родам адсюль».

Адбываюцца цікавыя сустрэчы ўдзельнікаў агляду-конкурсу з гледачамі. У Барысаве, Жодзіне і Салігорску пабывалі дзеячы эстонскага кіно, у Віцебскай вобласці — работнікі кіно Латвіі, на Магілёўшчыне — прадстаўнікі дэлегацыі Малдавіі. Яны расказалі пра апошнія работы сваіх студый, паказалі новыя фільмы.

Сёння ў кінатэатры «Партызан» адбудзецца ўрачыстае закрыццё X занальнага кінаагляду-конкурсу пяці рэспублік — Латвіі, Літвы, Эстоніі, Малдавіі і Беларусі. Журы падвядуць вынікі гэтага творчага спаборніцтва.

■

Занальны агляд-конкурс выклікаў шырокую цікавасць гледачоў. Вось што сказалі карэспандэнту «Літаратуры і мастацтва» некаторыя з іх:

Аляксандр МІРОНАЎ, пісьменнік:

— Мы бачылі сотні фільмаў пра фашызм. На жаль, многія з іх прасталінейныя і падобныя адзін на адзін. Не ведаю, якая думка складзецца ў членаў журы, але я перакананы, што карціна «Вар'яцтва» — удача эстонскіх кінематаграфістаў. У ёй глыбока ўскрыта ўся безразважнасць, усё вар'яцтва чалавеканенавісніцкай псіхалогіі фашызму. Відавочна бачыш, да чаго прыводзіць пачварнасць фашызму.

Ігар БАРАНОЎСКІ, урач:

— Я бываў у Малдавіі і палюбіў яе працавітых людзей, непаўторную прыгажосць прыроды гэтага сонечнага краю. Малдаўскія кінадакументалісты з замілаваннем паказалі нам і сваю сталіцу Кішынёў, і цудоўныя народныя зімовыя гульні «Маскі нашай зімы». Мне, як урачу, блізкая кінастужка «Увага, дзеці». Яна яшчэ і яшчэ раз папярэджвае дарослых: не будзьце раўнадушнымі, беражыце дзяцей, іх здароўе.

Адам МАЛЬДЗІС, кандыдат філалагічных навук:

— Нашу суседку — Літву я ведаю добра. Часта бываю ў Вільнюсе. Даводзілася працаваць у архівах і бібліятэках гэтага старажытнага горада. З цікавасцю ішоў глядзець фільмы літоўскіх майстроў кіно. На маю думку, у іх карцінах захаваны нацыянальныя рысы, бачна рэспубліка, народ, яго звычаі, песні, абрады. Літоўскі фільм не зблытаеш ні з якім іншым.

Хацелася б ведаць, што скажа журы пра фільм «Пачуцці». Мяне ж асабіста ўразіла гэтая стужка глыбінёй чалавечай псіхалогіі. Фільм увесь час трымае гледача ў настроі. Вітаўтас Жалакявічус, вядомы літоўскі кінадраматург і рэжысёр, не пазбягае складанасцей жыцця. Таму з такой пільнай увагай сочыш за лёсам галоўнага героя фільма, ростам яго свядомасці.

У дні агляду адбываюцца шматлікія сустрэчы яго ўдзельнікаў з гледачамі. Гэты здымак зроблены ў мінскім кінатэатры «Камсамолец», дзе дэманстраваўся эстонскі фільм «Людзі ў салдацкіх шынялях». Да гледачоў прыйшлі эстонскія госці Ю. Мююр (першы справа), В. Ларэнц (трэці справа), В. Андэрсан (чацвёртая справа).

Фота Ул. КРУКА.

СУСТРЭЧЫ

Ульянаўцы — народ на рэдкасць ахвочы да гасцей, хаця мабыць нямнога знойдзецца гарадоў, куды б іх прыязджала столькі, колькі сюды, на радзіму Ільіча. Вось і зараз, у час Дзён беларускай культуры, кожная сустрэча, кожны канцэрт, кожная выстаўка збіраюць шмат людзей — іх ледзь умяшчаюць ульянаўскія аўдыторыі.

На адной з такіх сустрэч я пазнаёмілася з чалавекам незвычайнага лёсу. Пра яго мне і хочацца сёння расказаць.

Гэта было ў адной з кнігарань Ульянаўска, дзе выступалі беларускія пісьменнікі Сяргей Грахоўскі і Мікола Ткачоў. Я звярнула ўвагу на пажылога чалавека, які з незвычайным хваляваннем слухаў беларускія вершы. Потым мы разгаварыліся. Мой новы знаёмы — Аляксандр Радзіёнавіч Кузняцоў сказаў, што прыезд беларусаў, сустрэча з імі для яго, акрамя ўсяго іншага, — вялікае асабістае свята.

— З Беларуссю звязаны ў мяне ладны кавалак жыцця — і шчаслівыя дні маладосці, і горкія дні вайны, — гаворыць мой субяседнік. — Да вайны мяне накіравалі на работу ў заходнія вобласці Беларусі. Я працаваў там дырэктарам школы. Вайна застала ў Картуз-Бярозе. У першыя ж месяцы быў паранены ў нагу і трапіў у палон. У лагеры — холад, голад, смерць таварышаў... І, як гэта ні дзіўна, у гэтых жахлівых умовах пісаў вершы. Між іншым заўважу, што свой першы паэтычны зборнік «Віяга» — рака тут такая ў нас ёсць — я выпусціў яшчэ ў 1927 годзе. Вершы ў лагеры я чытаў сваім таварышам і мне здавалася, што людзям гэта памагае, прыбаўляе ім бадзёрасці.

У 1942 годзе разам з дзесяццю сваімі таварышамі па лагеру ўцёк з палону. Шмат дзён ішлі на ўсход. У Бялынічах пастукалі ў адну з хат. Нас сустрэла бабулька і загаласіла: «А мае родненькія, а мае даражэнькія, заходзьце, заходзьце ў хату».

Толькі селі за стол, як дзверы адчыніліся і ў пакой увайшлі двое: адзін — высокі бялявы ў вайсковай нямецкай форме, другі — у цывільным.

— Хто старшы? — спытаў немец і прыцэліўся ў нас з пісталета.

Я ўстаў:

— Я.

— Куды ідзяце?

Мы стаміліся, не было больш сіл, на сэрцы адчай і мы хорам здзекліва закрычалі: «Да партызан!»

Раптам немец вымае з кішэні трыццатку і кладзе на стол.

— Запомніце Даньку Ломаўцава і Міхася Гулея.

Гэта былі хлопцы з партызанскай брыгады Макея Міхалапа. На ліку Міхася Гулея — шчасліўчыка, як мы яго называлі за пастаянную ўдачлівасць — было 18 варожых эшалонаў, пушчаных пад адхон. Ён зараз жыве ў Гродзенскай вобласці, працуе брыгадзірам-бетоншчыкам. А Данька Ломаўцаў потым загінуў у цяжкім баі пад Клічавам. Горад мы ўзялі, а ён загінуў...

Пра гэтых і іншых хлопцаў я напісаў кнігу, якая называлася «Макеевы хлопцы». Зараз працую яшчэ над адной — таксама на партызанскую тэму. Дарэчы, у вашым Музеі гісторыі Айчыннай вайны захоўваецца 16 нумароў часопіса «Чапаевец», які я рэдагаваў.

Ну, а што было потым? Потым доўга не гаіліся раны. Ляжаў паралізаваны і выхадзіла мяне ваша зямлячка — партызанскі ўрач Рахіль Аронаўна Краснапёрка, вельмі добры чалавек, ніколі яе не забуду.

Там, на беларускай зямлі пакінуў я цудоўных, чыстых і смелых сваіх сяброў. Многія з іх спяць вечным сном на зямлі, дзе нарадзіліся і якую мужна абаранялі. Я шчаслівы, што жыву ў горадзе, дзе нарадзіўся Ільіч і што мне выпала шчасце абараняць вашу зямлю — нашу зямлю. І што, нарэшце, праз столькі гадоў мы змаглі сустрэцца, як старыя, добрыя сябры.

■

А вось яшчэ адна сустрэча.

Адкрыццё мастацкай выстаўкі было прызначана на чатыры гадзіны дня. Я пайшла раней, каб пахадзіць па залах мастацкага музея, які размясціўся ў Доме-помніку, пабудаваным у гонар вялікага рускага пісьменніка Ганчарова. Але там ужо сабраліся людзі і чакалі адкрыцця выстаўкі.

Гэта цяжка растлумачыць — варта толькі-толькі ад'ехаць ад дому, як цябе ахоплівае пачуццё нейкага суму па вуліцах, па якіх крочыш кожны дзень, па родных пейзажах. І тут, у гасцях, адчуваеш пастаянна гордасць за ўсё гэта і ў той жа час хвалюешся за ўсё, што звязана з тваім краем, з тваім домам.

Вось і зараз, здавалася б, чаго хвалявацца — выстаўка добрая (не адной камісіяй адбіралася!). А хвалююся — ці спадабаецца ульянаўцам?

Па выстаўцы хаджу з мясцовым мастаком Іванам Васільевічам Ляжнёвым. Ён доўга моўчкі стаіць каля кожнай карціны.

— Ведаеце, — гаворыць Іван Васільевіч, — многіх вашых мастакоў я ведаў па розных выстаўках, пра іншых проста чуў, але не думаў, што ў Беларусі так многа розных майстроў. Не зблытаеш Савіцкага з Данцыгам, або цудоўную графіку Кашкурэвіча і Паслядовіч. Самае важнае ў мастацтве, мне здаецца, індывідуальнасць. Вось гэтай індывідуальнасцю вызначаецца ваша выстаўка. І яшчэ па выстаўцы можна ўявіць сабе вашу Беларусь, уявіць яе гераічны і працавіты народ. Цікава прадстаўлена ленінская тэма. Хаця і ўсю выстаўку можна назваць ленінскай: яна ж — пра ажыццяўленне вялікіх ленінскіх запаветаў.

■

А цяпер некалькі водгукаў ульянаўскіх гледачоў аб майстэрстве нашых артыстаў. Пасля канцэрта, які адбыўся ў зале абласнога драмтэатра, я падышла да Маргарыты Васільеўны Буравай, канструктара аблмясцпрома.

— Цудоўна. Толькі не падумайце, што я гавару гэта па доўгу гасціннасці. Мне вельмі спадабаліся два вашы цудоўныя, вельмі нацыянальныя калектывы: народны аркестр Жыновіча і народны хор Цітовіча. Мне здаецца таксама, што мастацтва Тамары Ніжнікавай і Ігара Сарокіна — гэта сапраўднае высокае мастацтва. У кожным іх нумары адчуваецца вялікая культура... Адным словам, проста здорава.

— Я бываю на канцэртах часта, — сказала Анастасія Васільеўна Ляпёшкіна, начальнік планавага аддзела абласнога аддзела аховы здароўя. — І даўно не мела такога задавальнення. А мы даволі-такі спешчаныя рознымі гастралёрамі. Я вельмі рада сустрэчы з вашымі майстрамі. Прыязджайце яшчэ. Гэта кажу не толькі я, але і мае таварышы, якія былі са мной на канцэрце. Гэта гавораць усе ўльянаўцы.

І. ПІСЬМЕННАЯ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

АРХІТЭКТУРА

АДЗЕННЕ БУДЫНКА

Ю. ГРЫГОР'ЕЎ,
кіраўнік 1-й майстэрні «Мінскпраекта»

ВЕЛЬМІ часта мы, архітэктары, чуем справядлівыя папрокі за тое, што нашы дамы, асабліва жылыя, — аднастайныя, невыразныя. Даводзіцца пагадзіцца з гэтымі папрокамі. Але, здаецца мне, корань зла ўсё-такі не ў тым, што быццам думка нашых архітэктараў лянівая, а фантазія бедная.

З пераходам будаўніцтва на індустрыяльныя рэйкі стварыліся аб'ектыўныя ўмовы не толькі для хуткага павелічэння колькасці жылых дамоў, бальніц, школ, дзіцячых садоў і іншых аб'ектаў масавага будаўніцтва, але і для значнага паляпшэння іх якасці. На жаль, гэты пераход быў успрыняты многімі, як паварот ад мастацкай творчасці да чыста тэхнічнай. Але ж тэндэнцыя зводзіць усе задачы горадабудаўніцтва толькі да тэхнізацыі і голай утылітарнасці звязана з небяспекай. Хочам мы гэтага ці не, архітэктура паўсядзённа ўплывае на фарміраванне нашага густу, не лічачыся з тым, да тэхнікі яе далучаюць або да мастацтва.

Творчы працэс архітэктара сёння павінен базіравацца на рэальных магчымасцях будаўнікоў, уліку тэхнічных сродкаў, пры дапамозе якіх узводзіцца і аддзелваецца будынак. Архітэктура—мастацтва спецыфічнае, таму што яна непасрэдна звязана з вытворчасцю, і таму для дасягнення станоўчых вынікаў у нас з будаўнікамі павінна быць адзінства поглядаў на канчатковы вынік нашай сумеснай працы.

Сёння будаўніцтва дома можна параўнаць з вытворчасцю аўтамабіля. Дэталі аўтамабіля робяцца на дзесятках заводаў, і толькі збіраецца ён на адным. Гэтак жа і з домам. Але недабраякасна выкананую дэталь ніхто на аўтамабіль не паставіць, а вось у будаўніцтве чамусьці гэта — звычайная рэч. Паглядзіце, напрыклад, на стыкоўку панелі з абабітымі і няроўнымі краямі, кладку з бітай цэглы з груба апрацаванымі швамі, вельмі дрэнную тынкоўку і афарбоўку сцен, нярэдка крывыя бетонныя перамычкі і г. д.

Якасць будаўніцтва ў многім залежыць ад кваліфікацыі і адказнасці будаўнікоў, асабліва аддзелачнікаў. Я часта бываю на будоўлях «па лініі аўтарскага нагляду» і нярэдка бачу бездапаможнасць прараба, які практычна не можа прымусіць выканаць, напрыклад, тынкоўку сцяны ў адпаведнасці з тэхнічнымі ўмовамі, таму што тынкоўшчыкі — у большасці сваёй маладыя людзі, яны маюць яўна нізкую кваліфікацыю, але якія ўжо добра засвоілі, што ім плацяць за колькасць, а не за якасць. Нізкая кваліфікацыя рабочых і слабая патрабавальнасць да іх з боку тэхнічных кіраўнікоў будоўлі выхоўваюць, на мой погляд, пагарду да якасці работы і безадказнасць. Да гэтага прывыкаюць і лічаць нармальнай з'явай. Вядома, ёсць і выдатныя спецыялісты сваёй справы, але яны, як правіла, працуюць на унікальных аб'ектах.

Адмаўленне архітэктуры як мастацтва вядзе да ігнаравання патрабаванняў архітэктара. Гэта перш за ўсё датычыць аддзелкі будынкаў —аднаго з важнейшых шляхоў эстэтычнага ўзбагачэння і інтэр'ера і экстэр'ера. Архітэктар павінен мець для работы шырокую палітру аддзелачных матэрыялаў. На жаль, гэта праблема стаіць сёння гэтак жа востра, як і пяць — дзесяць гадоў назад. Тэмпы будаўніцтва намнога апярэджваюць развіццё прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, перш за ўсё, аддзелачных: фарбавальнікаў, керамікі, палімераў, не гаворачы ўжо аб натуральных матэрыялах, такіх, як мармуровая і гранітная крошка, розныя фракцыі дрэва, — іх амаль няма.

У буйнапанельным домабудаўніцтве мы абмежаваны двума-трыма відамі аддзелкі фасадных панеляў. А чым аддзелваць фасады цагляных дамоў? Тынкоўка пад прамыўку з каменнай крошкай — працаёмкая і дарагая; тэразітавая тынкоўка з механізаваным метадам — недаўгавечная, да таго ж будаўнікі заўсёды спасылаюцца на недахоп белага цэменту; якаснай чырвонай аблiцовачнай і сілікатнай цэглы няма. Мне скажуць: а «кабанчык» (неглазураваныя і глазураваныя керамічныя пліткі)? Так, гэта сёння найбольш даўгавечны і практычны ў эксплуатацыі аддзелачны матэрыял. У свой час Дзяржбуд БССР абавязаў праектныя арганізацыі закладваць «кабанчык» для аддзелкі фасадаў перш за ўсё цагляных будынкаў. Было аб'яўлена, што ён будзе выпускацца розных расфарбовак і памераў. Я бачыў выдатныя ўзоры «кабанчыка» цудоўных пастэльных тонаў на выстаўках. Натуральна, архітэктары, не спешчаныя разнастайнасцю матэрыялаў, «накінуліся» на яго і сталі закладваць у свае праекты. Адпаведныя органы абавязалі «Мінскпраект» асвоіць у 1968 г. толькі для цагляных будынкаў 120 000 квадратных метраў плітак тыпу «кабанчык», а фактычна мінскія трэсты атрымалі каля 30 000 квадратных метраў (і то нізкай якасці — з адхіленнем ад памераў, з папярочнымі прагінамі). Ад плітак давялося адмовіцца: паспрабуй зрабіць роўнае шво паміж пліткамі, калі яны розныя па памерах.

Справядлівыя нараканні выклікае якасць сталярных вырабаў і матэрыялаў для насцілкі чыстай падлогі з дрэва. Грубыя адхіленні ад тэхнічных умоў, сырая драўніна, дрэнна апрацаваная верхняя паверхня — усё гэта вядзе не толькі да вялікіх затрат на выпраўленне, але і дыскрэдытуе многія добрыя ідэі праекціроўшчыкаў. Напрыклад, вокны са спаранымі пераплётамі на шарнірных завесах —іх вельмі зручна адчыняць, яны герметычныя і прапускаюць многа святла. Аднак з-за кепска наладжанай тэхналогіі іх вырабу на будоўлю такія пераплёты паступаюць з сырой драўніны, з перакосамі, шчылінамі, — у выніку заказчыкі адмаўляюцца ад іх.

А якое становішча з фарбавальнікамі? Кожны маляр ведае, што без белай маслянай фарбы немагчыма састаўленне большасці архітэктурных колераў. З-за яе адсутнасці аконныя пераплёты і дзверы даводзіцца фарбаваць у шэры або карычневы колеры, а сцены часцей за ўсё охрай. Не хапае стойкіх фарбавальнікаў для фасадаў, балконаў і лоджый. Фарбы, якімі карыстаюцца сёння, вельмі хутка выгараюць і змываюцца дажджамі.

Не хапае шклопластыку розных расфарбовак для абгароджвання экранаў балконаў і лоджый — гэтага выдатнага даўгавечнага матэрыялу, — і архітэктарам даводзіцца даваць згоду на ўжыванне плоскага шыферу.

Калі вы едзеце ў сучасным чыгуначным вагоне, міжвоўлі захапляецеся яго аддзелкай з пластыкаў, яго фурнітурай (ручкі, замкі, засаўкі і г. д.), сучаснай і дасканалай па форме. У будаўніцтве пластыкаў для аддзелкі амаль няма. Колькі гадоў ужо марым мы аб шпалерах, якія мыюцца, аб ланкрусце з сучасным малюнкам. А фурнітура?... Форма дзвярных ручак вызначана яшчэ ў XIX стагоддзі!.. Няма новых форм шпінгалетаў, дзвярных замкоў.

Безумоўна, будаўніцтва грамадскіх будынкаў, школ і дзіцячых садоў павінна ісці па шляху тыпізацыі і індустрыялізацыі. Але ці трэба лічыць, напрыклад, у школьным будынку размяшчэнню твор манументальнага жывапісу або павышэнне якасці і аддзелкі фасадаў з прымяненнем хоць бы каменнай тынкоўкі? У Будаўнічым банку, на жаль, такія работы яшчэ выкрэслываюць з каштарысу, спасылаючыся на неабходнасць барацьбы з празмернасцямі. Мы эканомім на гэтым паўпрацэнта-працэнт ад кошту будаўніцтва. Але хто ацэніць маральную страту, якую прыносіць шэрая невыразная забудова?

Роля манументальна-дэкаратыўнага мастацтва выразна вызначана яшчэ на заранку Савецкай улады ленінскім планам манументальнай прапаганды, згодна з якім савецкае манументальнае мастацтва павінна быць магутным сродкам выхавання і эстэтычнага ўзбагачэння працоўных. Мастак у садружнасці з архітэктарам павінны быць актыўнымі ўдзельнікамі будаўніцтва. Аднак пытанням мастацкага аблічча жылых дамоў, школ і дзіцячых садоў мы, па сутнасці, не ўдзяляем увагі. Пара знайсці арганізацыйныя формы ажыццяўлення манументальных дэкаратыўных работ у натуры. Можа мае сэнс выкарыстаць работы студэнтаў-мастакоў? А чаму нельга дыплом выканаць у натуры — на сцяне школьнай залы, на фасадзе жылога дома? Для гэтага трэба толькі забяспечыць дыпламанта неабходнымі матэрыяламі.

Недастаткова ўважлівае, а часам пагардлівае стаўленне да эстэтыкі архітэктуры і будаўніцтва не толькі кампраметуе нашу архітэктуру, адна з абавязковых умоў якой — бездакорная якасць выканання ў натуры, але і дэзарыентуе будаўнікоў і работнікаў прадпрыемстваў будаўнічай індустрыі, выхоўваючы ў іх абыякавыя адносіны да пытанняў эстэтыкі і якасці працы. Гэта прыводзіць не толькі да неахайнага выгляду новабудоўляў, але і да нізкай якасці будаўніцтва ў цэлым.

200 РОЛЯЎ — МАЛЫХ І ВЯЛІКІХ



ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Г. Ю. ГРЫГОНІСА

ЗАПЛЮШЧЫШ вочы і, здаецца, бачыш яго перад сабой: высокі, прамы, хударлявы, з нязменнай люлькай у зубах, з асабліваю хадою — так ходзяць па нашай грэшнай, але цвёрда ўмацаванай на трох кітах зямлі бывалыя прасоленыя і прасмоленыя «марскія ваўкі», якім сам чорт не брат.

Сёння Генрыху Юр'евічу споўнілася б 80 гадоў. Амаль пятнаццаць гадоў мінула, як перастала біцца і хваляваць справамі роднага купалаўскага тэатра ягонае сэрца, такое маладое і няўрымслівае, такое адкрытае жыццю і людзям...

Маладое, цяперашняе пакаленне купалаўцаў, напэўна, і ў вочы не бачыла аднаго з заснавальнікаў і колішніх карыфеяў свайго тэатра. Толькі з музейных стэндаў пільна сочыць за імі, маладымі, — ацэньваючы і параўноўваючы, а часам нібы з гарэзлівым выклікам: «Вы, цяперашнія, ну-тка!» — ягоны хітравата-ўсмешлівы і пранікліві позірк.

Які няўмольны лёс да акцёрскай творчасці — яе ўспрымаеш толькі тады, калі артыст на сцэне. І амаль нічога не застаецца, калі закрыецца заслона. Застаюцца хіба асобныя ўрыўкі са спектакляў, знятыя для кіно, ды пажоўклыя фотаздымкі, рэцэнзіі, магнітафонныя стужкі, што захавалі голас акцёра... І тады ажываюць легенды.

Вось адна такая легенда. А мо і не легенда зусім, а жывая быль? Расказваюць, што ў Генрыха Юр'евіча быў дзівосны дар — літаральна з нічога — з якіх дзвюх рэплік ён умеў ляпіць сцэнічны характар.

Так-такі з нічога?.. А яго жыццё — усе 65 гадоў, пражытыя на поўную магутнасць? Каго толькі не пабачыў ён на сваім вяку, з кім не сустракаўся, дзе не пабываў, вандруючы па свеце, пакуль не прыбілі яго маленькую шлюпку бурлівыя хвалі жыцця да прыстані — БДТ-1, тэатра, неўзабаве названага імем Янкі Купалы.

Я разглядаю захаваны ў архіве смешны малюнак-жарт з насценгазеты, спецыяльна выпушчанай у тэатры да 40-гадовага юбілею творчай дзейнасці народнага артыста рэспублікі, які адзначала грамадскасць у 1948 годзе. Зухаваты марачок з падзорнай трубой пільна ўглядаецца ў далячынь, дзе сярод успененых марскіх хваляў, нібы маяк, відаць знаёмыя нам абрысы будынка тэатра.

Але чаму — марачок?..

Пагартаем архіў артыста. Вось пажоўклая ад часу паперына — аўтабіяграфія.

«Нарадзіўся 20 мая 1889 года ў мястэчку Падбярэззе Віленскай губерні ў мяшчанскай сям'і. Бацька — служачы, маці — хатняя гаспадыня. Да 1906 года вучыўся. У 1906 годзе паехаў у Адэсу, дзе паступіў матроскім вучнем на параход «Балтыка» Рускага ўсходнеазіяцкага таварыства і паплыў ва Уладзівасток...»

Дык вось чаму марачок!

«...Праслужыўшы шэсць месяцаў, — з парахода звольніўся. Да паступлення на другі параход «Ардонія» працаваў разам з іншымі беспрацоўнымі маракамі грузчыкам ва Уладзівастоцкім порце, а пасля — на іншых дробных суднах. У 1907 годзе працаваў грузчыкам, адначасова ўдзельнічаў у спектаклях у тэатры «Залаты рог» у якасці статыста ў трупе І. М. Арнольдава. У 1908 годзе стаў акцёрам-прафесіяналам... Служыў у антрэпрызах Доліна і іншых ва Уладзівастоку, Благавешчанску, Хабараўску і іншых гарадах да 1915 года».

Уладзівасток, Харбін, Благавешчанск, Чыта, Мікалаеўск-на-Амуры, Хабараўск, востраў Сахалін... Гады вандраванняў... Дзесяткі роляў, сотні сустрэч, безліч назіранняў.

«У 1915 годзе паехаў у Петраград, дзе жылі бацькі. У лістападзе 1915 года быў прызваны ў армію... Пасля дэмабілізацыі з царскай арміі працаваў у розных тэатральных калектывах у Петраградзе».

Вось ён на фота—нечым нагадвае Сяргея Ясеніна — 20-гадовы кіраўнік драматычнага гуртка пры клубе трамвайнага парка.

«І затым акцёрам 6-га палярнага палка Чырвонай Арміі. У 1919 годзе, пасля выгнання Чырвонай Арміяй немцаў з Вільні разам з роднымі з Петраграда паехаў у Вільню... Служыў у рускім драматычным калектыве і ў гарнізонным клубе. У 1919 годзе ў час беларускай акупацыі жыў выпадковымі заробкамі. Іграў у калектыве пад кіраўніцтвам Еўсцігнея Афінагенавіча Міровіча, а пасля перайшоў у беларускі калектыў Першага таварыства драмы і камедыі. У студзені 1920 г. пераехаў у Мінск, дзе працягваў працаваць у Першым таварыстве драмы і камедыі. Пасля выгнання белапалякаў з Мінска служыў у рускай трупе пры Мінскім губеранскім ваенкоме і адначасова працаваў у Беларускім тэатры...»

І сёння, гартаючы старонкі небагатага архіву артыста — нешматлікія рэцэнзіі, рэдкія фота, пераважна аматарскія, успамінаю яго словы, запісаныя сябрам: «Мала радасці, калі артыст пакажа вам афішу, з якой відаць, што ён недзе некалі сыграў ролю хоць бы і Гамлета. Не! Ты пакажы, што ты можаш зрабіць сёння, тут, у гэтым тэатры!»

У гэтых словах — увесь Грыгоніс. Сапраўды тут, у гэтым тэатры, Генрых Юр'евіч рабіў цуды. З нічога. З аднойдзвюх рэплік умудраўся вылепіць характар, тып, вобраз — ды часам настолькі запамінальны, жыццёвы, яркі і па-артыстычнаму самабытны, што ён заставаўся з тымі, каму пашанцавала яго бачыць, на ўсё жыццё.

Вось хоць бы той самы дворнік Нічыпар са спектакля «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы. Гэта ён, дасціпны і мудры, дае апошні штрых, уносіць у спектакль апошні, такі смешны і пераможны акорд. Трэба было ўслухацца ў музыку слоў, у непаўторную «грыгонісаву» інтанацыю, пяшчотна-іранічную і з'едліва-ласкавую: «Цю-у-лік! Ах ты, воўча мяса! Праз цябе толькі непрыемнасці людзям!..» У гэтай рэпліцы, адрасаванай сабаку, які прывалок костку, што ўрэшце стала ўпоперак горла Гарлахвацкаму, акцёр выносіў і свой прысуд гора-вучонаму і гора-кіраўніку. Зала сустракала гэтыя словы дружным выбухам апладысментаў і рогату — смялася з Гарлахвацкага...

Генрых Юр'евіч прыйшоў на беларускую сцэну сталым акцёрам — за плячыма яго было больш за дзесяць гадоў працы ў прафесіянальным тэатры, дзе ён сыграў каля сотні роляў. І адразу ж заняў у трупе Першага БДТ вядучае становішча, як майстар вельмі шырокага дыяпазону, вынаходлівы і добрасумленны працаўнік, для якога не было маленькіх роляў, а кожная — адказная. Ён ніколі не пагарджаў, здавалася б, самай няўдзячнай працай: ну, хай сабе роля «без нітачкі», у дзве тры рэплікі — іграць, іграць трэба!

Пачаўшы з ролі Старца ў драме Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» і Пранцыся Пустарэвіча ў «Паўлінцы», Генрых Юр'евіч іграў ва ўсіх пастаўленых у тэатры п'есах Е. Міровіча, дзе на яго долю выпадалі пераважна ролі адмоўнага плана — Дораш («Машэка»), Мураўёў («Кастусь Каліноўскі»), Саламон — гаспадар лесапілкі («Перамога»), Бацька («Кар'ера «таварыша» Брызгаліна»), Ранкоўскі («Запяюць верацёны»), і Ул. Галубка — Стары пастух («Ганка»), Бацька («Апошняе спатканне»), Дзяк («Пісаравы імяніны»). Старыя купалаўцы і дагэтуль успамінаюць, як здзіўляў і захапляў сваім талентам пераўвасаблення Грыгоніс нават партнёраў па сцэне. У кожным спектаклі — зусім новы!

Мальер на беларускай сцэне — гэта бліскучыя старонкі творчасці і Грыгоніса. Гэта ж ён, Генрых Юр'евіч, быў першым «беларускім французам» — Журдэнам («Мешчанін у дваранстве») і першым Маскарылем («Манерніцы»). І наогул класічны рэпертуар, здавалася, быў яго стыхіяй — варта толькі ўспомніць, як ён іграў Місаіла («Барыс Гадуноў»), герцага Эскала («Рамео і Джульета»), графа Ладавіка («Сабака на сене»). Як майстар-чараўнік!

Яркія, нібы выхапленыя з жыцця вобразы ствараў акцёр у сучасных яму п'есах. І тут Грыгоніс паказваў цуды артыстычнага пераўвасаблення, і ні ў чым не былі падобнымі яго майстар Хадыка ў «Гуце» Р. Кобеца, стары Карп у «Ярасці» Я. Яноўскага, прафесар Дрызен у «Зямлі і небе» бр. Тур, кравец Балотнікаў у «Інзе» А. Глебава, Сапляк у «Канцы дружбы» К. Крапівы. У кожнай — прыклад таго, як трэба асэнсоўваць блізкія характары, тыпы сённяшняга дня або нядаўніх падзей.

Найбольш па душы былі Генрыху Юр'евічу вобразы сціплых і простых, цудоўных у сваёй чалавечай прывабнасці людзей. Яны ніколі не выглядалі ў яго «блакітнымі», кожны быў на дзіва «зямны». Здавалася, недзе ўжо ты сустракаў у жыцці і сціплага, клапатлівага ўрача-тэрапеўта Бубліка, які выслухаў за сваё жыццё дзевяноста тысяч сэрцаў, і прастадушнага рыбака Анісіма ў «Пагібелі воўка» Э. Самуйлёнка, і смешнага Галушку — «У стэпах Украіны».. Савельіч з «Капітанскай дачкі», Дзед у «Салаўі» Зм. Бядулі, Лірнік у «Кацярыне Жарнасек» М. Клімковіча—усе яны былі носьбітамі народнай мудрасці, чулымі выразнікамі душы народа, яго шчодрага вялікага сэрца.

І ўсё ж такі самымі яркімі былі ролі людзей смешных, хай сабе нават хоць трошкі, — Грыгоніс абавязкова здабываў гэтую якасць з характару. Выдатны камедыйны і характарны акцёр, Грыгоніс таіў у сабе і багатыя магчымасці акцёра драматычнага, якія, на жаль, выкарыстоўваліся рэжысурай вельмі рэдка. Бадай адзіная значная драматычная — лебядзіная песня Грыгоніса — роля Фірса ў спектаклі «Вішнёвы сад» А. Чэхава стала ўпоравень з лепшай у гэтым спектаклі роллю Ранеўскай, сыгранай В. Галінай.

Варта прыгадаць яшчэ адну цікавую старонку з біяграфіі артыста — Грыгоніс быў адным з першых беларускіх кінаакцёраў. Ён здымаўся ў вядомай карціне Аляксандра Даўжэнкі па сцэнарыі беларускага пісьменніка Іларыёна Барашкі «Дняпро ў агні» (1937 г.) у ролі Гусака. У фільме «Кармалюк» (1938 г.) рэжысура запрасіла нашага акцёра на невялічкую, але вельмі каларытную ролю попіка. Генрых Юр'евіч здымаўся тут разам з вядомым украінскім акцёрам Гнатам Юрой.

Вядома, што адной з найбольш характэрных рысаў Першага БДТ была (і застаецца ў тэатры імя Я. Купалы) ансамблевасць яго трупы. Генрых Грыгоніс быў яркім самацветам у гэтым ансамблі — ён умеў на поўны голас гаварыць у галоўных ролях і, калі таго вымагала п'еса, «загубіцца» ў натоўпе. Для яго не існавала праблемы, кім быць на сцэне — майстрам «малой ролі» ці прэм'ерам, бо ён разумеў, што быць артыстам такога тэатра — азначае добра і патрабавальна выконваць тое, чаго чакае ад цябе сёння аўтар, рэжысёр і глядач. Яго мастацтва як бы папярэдзіла нараджэнне ў купалаўскай трупе вялікага майстра камедыі Г. П. Глебава, якому Генрых Юр'евіч нібы перадаў эстафету, мабыць, самага смешнага беларускага артыста. Смешнага і натуральнага — сапраўднага мастака!

Тамара БУШКО.

ТЭАТР

КАЛІ НА СЦЭНЕ САМА МАЛАДОСЦЬ...

«СЛУГА ДВУХ ГАСПАДАРОЎ» К. ГАЛЬДОНІ У ТЭАТРЫ ІМЯ Я. КОЛАСА

Зразумела, калі на сцэне камедыя Карла Гальдоні, дык абавязкова тут будуць каханне і смех, лёгкі смутак і шчодрыя слёзы, гарэзлівыя жанчыны і хітраватыя слугі, паважныя ці блазнаватыя гаспадары і іх нарвістыя дзеці. Плашчы, шпагі. Серэнады пад балконам. Іскрыстыя танцы. І сотні розных кві пра кво.

Усё гэта можна сказаць і пра спектакль «Слуга двух гаспадароў», які ідзе ў тэатры імя Якуба Коласа.

Цікавае відовішча стварыў рэжысёр С. Казіміроўскі ў дэкарацыях А. Салаўёва з музыкай Б. Насоўскага. Сярэдні ўзрост ансамбля артыстаў, занятых у «Слузе», толькі набліжаецца да трыццаці. Гэта спрыяла стварэнню атмасферы высокай камедыйнасці. Маладыя акцёры лёгка рухаюцца, спяваюць, танцуюць... Каханне і рэўнасць на сцэне выглядаюць сур'ёзна, як у псіхалагічнай драме, але разам з тым спектакль іграецца з добрай іранічнай падсветкай. Акцёры быццам згаварыліся, што на некаторы час яны са шчырым захапленнем паглыбяцца ў свет фатальных страсцей, а потым— тактоўна, з добрым пачуццём тэатральнасці і мастацкага густу! — адкрыюць гледачам, што ўсе падзеі ў доме Панталоне дэй Бізаньёзі і ў гасцініцы, дзе спынілася Беатрычэ Распоні, ўсё ж не варта так сур'ёзна ўспрымаць. Усё гэта трохі жарты, хоць і жарты вучаць нас адрозніваць каханне ад прытворства, высакароднасць ад пошласці, апранутай у прыстойнасць, народную кемнасць ад панскай дурнаты (ад яго вялікасці Ёлупа!)

Назваўшы першую добрую якасць спектакля — маладосць, якая надала відовішчу вясёлы характар і ўнутраную дынаміку, скажам і пра другую. Гэта — адзінства акцёрскага ансамбля. У гэтым ансамблі першую скрыпку іграе артыст Георгій Дубаў, які стварыў надзвычай дакладны ў сцэнічным малюнку характар і, у той жа час, традыцыйную для італьянскай камедыі дэль артэ маску. І хоць Г. Дубаў выступае не ў галоўнай ролі, на яго манеру ігры арыентуюцца, да яе падключаюцца ўсе ўдзельнікі спектакля. Г. Дубаў натуральна ўваходзіць, калі трэба, на роўных правах і ў дуэты, і ў трыо. Напрыклад, трыо старых выглядае ў спектаклі асабліва маляўніча — побач з Панталоне вельмі каларытныя доктар Ламбардзі ў выкананні артыста Мікалая Цішачкіна і Брыгела — Іван Вашкевіч. Сачыць за іх прыгодамі, сваркамі, славеснымі і фізічнымі паядынкамі цікава нават тады, калі ты і здагадваешся, чым усё скончыцца.

Спектакль знаёміць са стракатай галерэяй чалавечых характараў-масак. Кожны выканаўца, жывучы ў вобразе, нібы адцяняе па законах кантрасту своеасаблівасць таго, з кім яму даводзіцца ўзаемадзейнічаць на сцэне.

Праз афарбаваны лірызмам тэмперамент «задзірыстага пеўніка» раскрывае пацешныя страсці свайго героя артыст Баляслаў Сяўко (Сільвіо), а Фларында Рэтузі падаецца артыстам Леанідам Трушко пераважна ў рамантычным асвятленні. Тэмпераментна іграе ролю Фларында Аляксандр Кацельнікаў, уносячы ў характар тыповага любоўніка італьянскай камедыі адценні ганарлівай высакароднасці, і гэта ўзбагачае спектакль з яго ўдзелам новымі фарбамі.

Выканаўцы, прытрымліваючыся агульнага малюнку, вызначанага п'есай і рэжысурай, свабодна імпрэзіруюць. Тое, што сёння было празмерна жартаўлівым, заўтра можа быць больш прасякнута лірыкай або раптам ператварыцца нават у буфанадны нумар. Зрэшты, інакш Гальдоні іграць і нельга: камедыёграф дапускаў імпрэзацыю нават у тэксце, а што ж тады і казаць аб прыёмах акцёрскага выканання, якія падказваюцца партнёрамі і рэакцыяй глядзельнай залы. Вось, хоць бы, напрыклад, зусім эпізадычны персанаж, слуга-турак, якога іграе пераведзен нядаўна ў трупу з дапаможнага складу артыст Яўген Шыпіла. Нібы маленькі сейсмограф, ён у сваіх паводзінах фіксіруе ўсе сённяшнія перамены ў выканаўцаў галоўных роляў, з якімі слуга сустракаецца...

Даруйце, я ўсё пра мужчын, ды пра мужчын. А якія яны чароўныя і прывабныя — жанчыны з камедыі Гальдоні на віцебскай сцэне! Каму з іх аддаць перавагу? Разгубішся ў гэтым кветніку дасціпных і прыгожых, вострых на язык і харэаграфічна яркіх у рухах «жанчын сонечнай Венецыі». Хочацца спадзявацца, што і Ніна Левашова (Смеральдзіна), і Тамара Шашкіна (Беатрычэ Распоні), і Галіна Андрэева (Клярычэ, дачка Панталоне) самі надоўга запомняць тое сапраўды артыстычнае самаадчуванне, з якім яны выходзяць на сцэну, каб захоплена жыць у імклівым віры займальных падзей. Шчодрасць пачуццяў — вось што аб'ядноўвае гэтыя рэзка непадобныя характары. Дзейсныя сцэнічныя задачы, якія выконваюцца актрысамі, падказваюць ім і самыя патрэбныя фарбы з моўнай палітры. Гераіням спектакля ўласцівы валявы імпульс — яны ўмеюць змагацца за сваё шчасце, карыстаючыся пры гэтым усімі сродкамі жаночай прывабнасці.

А цяпер пра таго, хто вызначыў назву камедыі — пра галоўнага сярод усіх слуг, пра Труфальдзіна. Артыст Тадэвуш Кокштыс іграе цэнтральную ролю ў спектаклі ўпершыню. Своеасаблівы дэбют. І — шчаслівы. Праўда, акцёр яшчэ крыху аднастайны ў сваіх прыёмах і інтанацыях, ад Труфальдзіна ж чакаеш сотні нюансаў у паводзінах і ў мове. Гэтага пакуль што няма. Але затое Т. Кокштыс разумее прыроду градыцыйнай маскі-вобраза і ўмее закрануць у камічным персанажы жыццёвы грунт. У некаторых эпізодах у гэтым персанажы адчуваеш народную кемнасць і дзёрзкі розум «чалавека з вуліцы», вымушанага служыць двум гаспадарам. А перадаць гэта ў Труфальдзіна — удача не малая. І трэба спадзявацца, што роля будзе адной з любімых Т. Кокштысам і ён яшчэ знойдзе ў сваім акцёрскім тэмпераменце разнастайныя па характары выбухі гневу і злой іроніі, лірычную засяроджанасць і той сум, які хаваецца за маскай на ўсё гатовага слугі.

А Г. Андрэевай можна параіць, наадварот, не стрымліваць сябе ў жаданні адступіць ад знойдзеных у часе рэпетыцый інтанацый, свабодней выбіраць сцэнічныя фарбы ў кожным эпізодзе і ў партнёрстве з рознымі выканаўцамі.

Чаму мы спыняемся на гэтых пажаданнях у адрас акцёраў? Па-першае, таму, што акцёры дэманструюць добрую падрыхтоўку да выступленняў у камедыйных ролях. А кіраўніцтва тэатра, выбраўшы з творчасці К. Гальдоні гэту — адну з лепшых і складаных для сцэнічнага ўвасаблення, асабліва сіламі творчай моладзі, камедыю, дало новаму пакаленню коласаўцаў удзячны матэрыял. Тут можна смела імпрэзіраваць, раскрываючы свае індывідуальныя здольнасці — уменне пераўвасабляцца, жыць у прапанаваных умовах і рамках жанру, выступаць у вакале і танцах, раскрываць свае пластычныя дадзеныя. Удзельнікі спектакля ўжо іграюць з захапленнем — ім падабаецца, як усё ў іх атрымліваецца. Добра! Але хай гэта не перарастае ў самазадаволеную ўпэўненасць у поўнай перамозе. Такой, здаецца, і не бывае, і заўтра заўсёды можна сыграць тое ж самае значна лепш, глыбей і арыгінальней...

Тэатр дасягнуў асноўнай мэты — камедыя ўспрымаецца як па-сучаснаму асэнсаваны плашчадны фарс, амаль балаганнае відовішча з элементамі пародыі на «высокі стыль» і, адначасова, як павучальная гісторыя чалавечых узаемаадносін. Як і ў любой казцы, у спектаклі ёсць намёк і «добрым малайцам урок» — каханнем трэба даражыць. Хоць выснова не дужа арыгінальная і новая, тое, як тэатр вядзе да яе гледачоў, — цікава, па-сцэнічнаму кідка, захапляюча. Калі ж дадаць, што камедыя К. Гальдоні на сцэне віцяблян добра глядзіцца — і тут вялікі ўклад зрабіў таленавіты і вынаходлівы мастак Аляксандр Салаўёў, дык стане відавочным: «Слуга двух гаспадароў» з тых спектакляў, на якія мы ідзём як на святочнае відовішча, якому бываюць рады і тыя, хто яго паказвае, і тыя, хто глядзіць.

У. ДРЫЛЯ.

Навучэнцы таваразнаўчага аддзялення гарадскога прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча № 32 г. Мінска праходзяць практыку ў кніжных магазінах сталіцы. Гэты здымак зроблены ў аддзеле беларускай літаратуры Цэнтральнага кніжнага магазіна. Навучэнка вучылішча Тамара Кобец атрымлівае літаратуру ў загадчыцы аддзела мастацкай літаратуры Святланы Адамейка.

Фота Ул. КРУКА.

НОВЫЯ ЭКСПАНАТЫ МУЗЕЯ

Новымі матэрыяламі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна папаўняецца Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя Суворава. Экспануюцца дакументы пра ўстанаўленне Савецкай улады на тэрыторыі раёна.

Увагу наведвальнікаў прыцягваюць лістоўкі і газеты часоў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Сярод іх «Солдатская правда», «Боевая правда», «Красный воин». Тут жа экспануецца фотакопія дэкрэта Савета Народных Камісараў аб стварэнні Чырвонай Арміі, падпісанага У. І. Леніным. Цікавасць уяўляе ўзор першай кніжкі чырвонаармейца. Па ўказанні Уладзіміра Ільіча ў ёй былі змешчаны цытаты з суворaўскай «Навукі перамагаць».

Работнікі музея рыхтуюць перасоўныя выстаўкі «Ленін у Пецярбурзе-Петраградзе», «Тут жыў і працаваў Ленін», «Імя Леніна».

Л. МАГІЛЯВЕЦ.

ГАСЦІННАСЦЬ І ЦЕПЛЫНЯ

ТВОРЧЫЯ ВЕЧАРЫ МАЙСТРОЎ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ У ЛЕНІНГРАДЗЕ

Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ,
народная артыстка СССР, старшыня праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання

НЕ УПЕРШЫНЮ работнікі беларускага мастацтва сустракаюцца з ленінградцамі. І кожны раз гэтыя сустрэчы прыносяць нам узаемную радасць і задавальненне.

У гэтыя майскія дні група майстроў мастацтва Беларусі зноў наведала горад Леніна. Першая наша сустрэча адбылася ў Доме ветэранаў сцэны імя Савінай. Усе сабраліся ў канцэртнай зале. Пасланцы Беларусі выступалі перад удзячнай, поўнай строгай увагі аўдыторыяй. Нас слухалі старэйшыя таварышы, майстры, карыфеі сцэны. Іх апладысменты, воклічы «брава», «малайцы», «біс», усмешкі на радасных тварах—адразу саграваюць сэрцы, як цёплыя праменні цудоўнага майскага дня. Мы пакідаем Дом ветэранаў сцэны, поўныя незабыўных уражанняў.

Назаўтра — новая цікавая сустрэча. Завод «Электрасіла»—буйнейшае прадпрыемства нашай краіны. Абедзенны перапынак. Зала поўная людзей, якія толькі што пакінулі станкі. У сэрцах—новы творчы зарад. З натхненнем пяецца, танцуецца...

Заканчваецца канцэрт. Са шчырай удзячнасцю выходзяць на сцэну кіраўнікі завода. Братэрскія поціскі рук, абмен сувенірамі. Мы беражліва прымаем на памяць ключ—сімвал дружбы.

Трэцяе наша выступленне — у час яшчэ адной сустрэчы з работнікамі мастацтваў Ленінграда. І зноў хваляванне, творчы ўздым, жаданне дастойна пазнаёміць з мастацтвам нашай рэспублікі. Чытаюцца творы беларускіх паэтаў, расказваюцца ўрыўкі са спектакляў Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, «Кастанцін Заслонаў», «Рудабельская рэспубліка», «Людзі на балоце», «Лявоніха на арбіце». У рэпертуары канцэрта—руская і заходняя класіка, творы савецкіх кампазітараў, народныя песні, танцы.

У канцы гучаць словы прывітальнага адрасу праўлення Ленінградскага аддзялення Усерасійскага тэатральнага аб'яднання і савета Палаца работнікаў мастацтваў імя Станіслаўскага:

«Мы, работнікі мастацтваў Ленінграда, ведаем, наколькі важныя і плённыя для ўсіх нас творчыя сустрэчы, падобныя сённяшняй. Яны напамінаюць нам аб той адказнасці за лёс савецкага мастацтва, які кладзецца на плечы кожнага з нас, аб тым велізарным даверы, з якім чакае нашай творчай працы глядач».

На сцэну выносяць велізарны каравай, у якім гарэла пяцьдзесят свечак—у гонар 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Усеагульнае захапленне выклікаюць і нашы сувеніры, зробленыя рукамі беларускіх умельцаў з саломкі, стружкі, пянькі, а таксама кнігі пра Савецкую Беларусь.

У творчых сустрэчах з ленінградцамі прынялі ўдзел народныя артысты СССР Т. Ніжнікава і З.

СЯРОД КНІГ

Пра першую кніжку пісьменніка

ШТО АБЯЦАЕ ПАЧАТАК ДНЯ?

НЯДАЎНА выйшла ў свет першая кніга Івана Шальманава — зборнік апавяданняў «Дзень пачаўся». Апавяданні. Пра што гаворыць у ёй малады літаратар? Нагадаем некалькі апавяданняў.

Нялёгка адразу зразумець, што за чалавек машыніст Пяхцецкі. Нават тыя людзі, якія працуюць побач з ім па многу гадоў, гавораць аб ім па-рознаму. Тым больш цяжка разабрацца ў гэтым маладому хлопцу Алесю — качагару на паравозе, які водзіць Пяхцецкі. Працавіты, даверлівы, падатлівы на чалавечую дабрату, хлопец напачатку быццам і здружыўся з Пяхцецкім. Але гэтая дружба не па душы ленаватаму памочніку машыніста Пацяруху. І ён дамагаецца свайго: дружба хлопца са старым машыністам як лёгка наладзілася, так лёгка і разладзілася. «А пачалося ўсё гэта пасля таго, як я «замачыў» з Васілём Пацярухай сваю першую палучку». З кожным днём Пяхцецкі адносіцца да Алеся ўсё халадней і халадней. І вось Пацяруха ўжо здаецца Алесю «неблагім хлопцам», а Пяхцецкі — «бяздумным эгаістам». Нічога не змянілася і пасля таго выпадку, калі Пяхцецкі выручыў Алеся з бяды. Наадварот, пабываўшы ў старога дома, пабачыўшы Пяхцецкага не на рабоце, а ў сям'і, Алесь канчаткова пераконваецца: «Уласнік!» Але вось праз некалькі гадоў Алесь вычытвае ў газеце скупую інфармацыю пра тое, што пенсіянер Пяхцецкі, той самы, сад якога вартаваў «злы сабака», той самы Пяхцецкі, пра якога казалі, што ён «збіраў капейку», перадаў свой дом з усёй маёмасцю пад дзіцячы сад. З фотаздымка ў газеце на хлопца пазіраў «шчаслівы дзядзька Кастусь» і нібы гаварыў: «От бачыш, Алесь...» Хлопец даруе Пяхцецкаму ўсе яго ранейшыя грахі і глядзіць на яго з павагай.

Гэта апавяданне «Абэрак»...

Дзіўны чалавек Палікар. Ніяк не могуць зразумець яго хлопцы, хоць і жывуць разам з ім у адным пакоі. Гэта ж трэба — звязаўся з пажылой жанчынай, удавой, ходзіць да яе, па гаспадарцы памагае, дзіцяці калыску майструе. А от цяпер прызнаўся, быццам заяву ў ЗАГС занёс. Але ў дзень вяселля Палікар прыводзіць у пакой... маладую дзяўчыну, а ўдава Волька аказваецца названай маці.

Гэта — апавяданне «Палікар»...

І яшчэ адно — «Міргун і Зэлік».

Жывуць у вёсцы два заядлыя паляўнічыя — Мікола Зэлік і Сымон Міргун. Мікола ўсё ніяк не можа ўзбіцца на добрага сабаку. А ў Сымона Джэрык — цаны яму няма. І от здарылася так, што Мікола сутыкнуўся з Сымонам у лесе якраз тады, калі Сымон забіў лася. Каб Зэлік маўчаў, Міргун вырашае аддаць яму Джэрыка. Узяў быў Мікола павадок у руку, ды выпусціў: сумленне не дазволіла...

Тры апавяданні, тры выпадкі. Магчыма, нават, шыццёвыя. Аднак хочацца спытацца ў аўтара: ну і што? Чым цябе прывабілі гэтыя выпадкі? Што ты ўбачыў за імі? Мне, чытачу, адказаць на гэтыя пытанні цяжкавата, бо ўчынкі Пяхцецкага, Палікара і Зэліка тут толькі названы, а не раскрыты.

А між тым і гэтыя, і іншыя апавяданні зборніка чытаюцца нават з пэўнай цікавасцю. У іх ёсць нямала трапных і дакладных дэталей, шэраг тонкіх жыццёвых назіранняў. Пісьменнік умее стварыць настрой, знайсці даверлівую інтанацыю. Вось, напрыклад, як хораша гучыць пачатак таго ж апавядання «Міргун і Зэлік»: «Не шанцуе на сабак Міколу Зэліку. І ў каго толькі не браў ён шчанят... А шчанюк то чарвяка, як кажуць, не перагрызе, маленькім здохне, то хоць і вырасце вялікі, дык на следзе нікуды не варты: у гаспадара пад нагамі блытаецца, стрэлу баіцца. А якое гэта паляванне без сабакі, ды яшчэ ў такіх лясах, як нашы?»

Аднак у гэтых апавяданнях няма, мне здаецца, галоўнага: за персанажамі з тымі ці іншымі імёнамі не адчуваецца пэўнай чалавечай асобы, акрэсленага чалавечага характару. Сума ўчынкаў, як вядома, гэта яшчэ не характар. Патрэбна паглыбленне ў духоўны свет чалавека, псіхалагічная матывіроўка ўчынкаў героя. Відаць, толькі тады пісьменнік можа выйсці за вузкія межы канкрэтнага, няхай сабе і жыццёвага, факта, зможа ў мікрасвеце апавядання адлюстраваць вялікі свет з яго вялікімі праблемамі.

Само сабой зразумела, што расказаць пра нейкую падзею, апісаць нейкі ўчынак чалавека лягчэй, чым паказаць духоўны воблік чалавека і яго псіхалагічныя магчымасці. І шкада, што І. Шальманаў даволі часта дае сабе гэтую палёгку, саступае на гэтую лягчэйшую сцежку.

А павярхоўны, збеднены паказ чалавечай душы цягне за сабой і беднасць мастацкіх, выяўленчых сродкаў. У апавяданнях І. Шальманава, калі любяць сябра, дык абавязкова «як брата роднага», калі цёмна, дык «хоць вока выкалі». На кожным павароце, пры кожнай змене пачуццяў ставяцца стандартныя ўказальнікі: «мы з затоенай трывогай сачылі», «мы дужа перажывалі», «у мяне з ім склаліся добрыя адносіны», «ён адносіўся да мяне ўсё халадней і халадней», «нейкая халодная туга скрабанула за сэрца» і г. д.

Міжволі ўспамінаеш словы Д. Фурманава: «Няма нічога горшага, чым бясколернасць шаблонных эпітэтаў — замест тлумачэння паняцця і вобраза яны яго толькі зацямняюць, бо топяць у шэрай гушчы ўсеагульнасці».

Найбольш удалым уяўляецца мне апавяданне «Катары-матары». У ім пісьменнік тым жа шляхам, што і ў іншых апавяданнях: спачатку расказвае пра чалавека ўсё, што ведае, а ў канцы здзіўляецца нечаканаму ягонаму ўчынку. Праўда, удалося гэтае апавяданне зноў-такі не таму, што І. Шальманаў паспрабаваў паказаць чалавека знутры, а таму, што выбраў такую сітуацыю, у якой выявілася сутнасць чалавека, сітуацыю, у якой унутранае выяўляецца праз знешняе. Гумар існуе тут не сам па сабе, як у апавяданні «Палікар», а робіцца прыёмам, які садзейнічае паказу чалавечых душ.

Алена не прычакала з вайны мужа. «Паплакала, паплакала, а жыць трэба. Трэба сына гадаваць. А яго няшмат і гадавала. У сваім гародзе, пад грушай, на міне падарваўся.

Не плакала Алена па сыну. Нават калі на кладаўе неслі і магілу засыпалі — не плакала. Толькі ні з кім не гаварыла, нібы каменнай зрабілася».

Нялёгка склалася жыццё і Хведара Бірука. «Калі сказаць па праўдзе, дык Хведар Бірук даводзіцца мне нейкай раднёй. Здаецца, мой дзед і ён былі сваякамі. Ну, а я — зусім дзесятая вада на кісялі. Але стары дужа радніўся. Можа, таму, што ў яго нікога з блізкіх не было. Адзін, як дубец. Сям'ёй не абзавёўся, так вось старым халасцяком век і дажывае». Маладым ён кахаў адну дзяўчыну, і яна яго кахала. «Пакахаць пакахалі, а што далей рабіць — розуму не прыкладуць: такога жаніха, як ён — Хведар сам ведаў, — Рыгорчык і на парог не пусціць. Бо Хведар хоць і адзіны ў бацькоў, ды бядняк бедняком, самы што ні ёсць апошні ў вёсцы.

І парашыў ён выкрасці сваю каханку, павянчаца з ёю тайком. Але ці даказаў хто, ці сам Рыгорчык здагадаўся — на паўдарозе да царквы дагнаў іх Дзярыба з людзьмі. Хведара ледзь не да смерці прыбілі, а Ганку бацька прывёз дамоў, пад замок запёр у пакоі, праз дзень знайшоў ёй багатага жаніха і пачаў рыхтавацца да вяселля.

Але замест вяселля справіў Рыгорчык Дзярыба па сваёй дачцэ хаўтуры. Не стрывала, павесілася Ганка».

Прайшлі гады, і вось Алена вырашыла «прыгрэць» Хведара. Пасля некалькіх гумарыстычных абставін справа скончылася тым, што вёска загаварыла аб хуткім вяселлі Хведара і Алены. Пэўная раптоўнасць паводзін Хведара — лагічны вынік яго характару: Хведар і баіцца, і супраціўляецца лёгкасці вырашэння такога важнага пытання, як жаніцьба.

Памаладзеў Хведар (і зусім не таму, што пагаліў бараду), павесялела і Алена. Не, жыццё гэтых двух людзей пасля таго, як запозненае шчасце завітала і да іх, не стала бесклапотным. Проста яно набыло той нармальны, будзённы, але вельмі неабходны чалавеку рытм. А мінулае... Мінулае не-не ды прарвецца праз раптоўныя слёзы Алены: «Нам што, нам ужо нічога. Вас шкада. Маладых ды прыгожых. Ды і мне. Думаеш: з дваццаці год без мужыка засталася. І Алёшка... Ужо недзе быў бы гэткі, як ты,—яна заміргала вачамі і закрылася фартухом».

Тут ёсць не толькі расказ пра чалавека — тут ёсць і сам чалавек, са сваім клопатам, горам, радасцю, лёсам...

«Дзень пачаўся» — так назваў сваю першую кнігу малады празаік. Якім абяцае быць гэты дзень? Гэта ў многім залежыць ад самога пісьменніка.

М. ТЫЧЫНА.

Іван Шальманаў. «Дзень пачаўся». Апавяданні. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1969.

КАДРЫ КІНАЛЕТАПІСУ — СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

Сёлета беларуская кінематаграфія будзе адзначаць сваё саракапяцігоддзе. І выхад у свет калектыўнай працы беларускіх кіназнаўцаў — першай кнігі двухтомнай «Гісторыі беларускага кіно» вельмі дарэчы.

У гэтым даследаванні сістэматызаваны і абагульнены творчы вопыт і спадчына некалькіх пакаленняў беларускіх кінематаграфістаў. Упершыню адзіным поглядам ахоплены такі велізарны фактагалічны матэрыял, выкарыстаны малавядомыя дакументы і ацэнены фільмы з цэнтральных і беларускіх архіваў і кінафондаў. Перад чытачом разгортваецца шырокая панарама развіцця беларускага нацыянальнага кінамастацтва на працягу двух з палавінай дзесяцігоддзяў — з дваццаць чацвёртага па сорак пяты год. Гэта быў час станаўлення ўсяго савецкага кінамастацтва, калі яно заявіла аб сабе з незвычайнай сілай, аказваючы глыбокі ўплыў на кінамастацтва многіх краін. І асаблівая ўдача «Гісторыі беларускага кіно» ў тым, што аўтары здолелі даць карціну развіцця беларускага кіно ў непарыўнай сувязі з пошукамі, задачамі і дасягненнямі майстроў усесаюзнага экрана.

Зусім правамерна, напрыклад, «Лясная быль» Ю. Тарыча ставіцца па трактоўцы тэмы рэвалюцыйнай героікі побач з «Чырвонымі д'ябалятамі» І. Перасціяні. (У той жа час прасочваюцца глыбока нацыянальныя карэнні першага беларускага мастацкага фільма, якія звязваюць яго з літаратурнай творчасцю М. Чарота і «маладнякоўцаў»). Пераканаўча раскрываецца ўплыў даўжэнкаўскіх традыцый «паэтычнага кіно» на адзін са значных фільмаў дагукавога перыяду — «У агні народжаныя» У. Корш-Сабліна, які паказвае своеасаблівасць развіцця рэвалюцыі ў Беларусі. Такі ж прынцып разгляду выразна відаць і ў раздзелах, прысвечаных дакументальнаму кінематографу пачатку трыццатых гадоў, тут гаворыцца аб творчым успрыняцці беларускімі дакументалістамі метадаў экраннай публіцыстыкі Д. Вертава (нарыс «На ўздыме»).

Удала знойдзена і структурнае вырашэнне кнігі. Прытрымліваючыся, у асноўным, храналагічнага парадку, аўтары вылучаюць тэматычныя вузлы і асобныя, найбольш значныя для кожнага этапа, творы. Вельмі добра ўспрымаецца расказ аб першых метрах хронікі, знятых у гады рэвалюцыі, аб першых мастацкіх фільмах пра жыццё народа, аб унікальных здымках на франтах і ў партызанскіх атрадах у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Перад чытачом як бы праходзіць гісторыя фарміравання новага чалавека, усталяванне новых маралі і этыкі нашага грамадства — таму што ўсе гэтыя праблемы былі мастацкім зместам беларускіх фільмаў. Аўтары нарысаў здолелі паказаць, што беларускія майстры экрана імкнуліся быць у рэчышчы грамадскай і палітычнай думкі і сваёй творчасцю ўдзельнічаць у сацыялістычнай перабудове жыцця. Няхай не ўсе творы беларускіх кінематаграфістаў былі дасканалыя, няхай не заўсёды яны здабывалі творчыя перамогі, але кожная іх стужка — ад плакатных твораў агітпропа і няхітрых сюжэтаў у першых кіначасопісах да лепшых фільмаў Тарыча, Корш-Сабліна і Аршанскага — была для свайго часу дзейснай зброяй ідэйнага і эстэтычнага выхавання масавага гледача. Пра гэта сказана ў кнізе пераканаўча і доказна.

Шмат гадоў прайшло з той пары, калі былі зазняты першыя беларускія кінастужкі. Час — аб'ектыўны праявіцель вартасцей мастацкага твора. Цэнячы ўсё тое, што здабыта і заваявана майстрамі беларускага экрана і складае дарагую ўсім нам спадчыну, аўтары «Гісторыі беларускага кіно» не ўхіляюцца ад крытычнага аналізу гэтай спадчыны. Часам яны спрачаюцца з устойлівымі рэпутацыямі некаторых стужак мінулых гадоў, уступаюць у дыскусію з тагачаснай крытыкай. І шкада толькі, што старонкі, дзе даецца новае асэнсаванне некалі папулярных стужак, напісаны сухаватай мовай і складаюцца пераважна з пераказу зместу фільма і катэгарычных ацэнак. А хацелася б пачуць і ўсхваляваны голас эмацыянальна ўзрушанага крытыка-гледача, здольнага расказаць пра сваё ўспрыманне твора вобразнай мовай, жыва і непасрэдна.

Увогуле ў кнізе засталося нешта ад былой манеры крытыкі гаварыць пра мастацтва, пераказваючы сюжэтныя перыпетыі ды на дзіва схематычна «інвентарызуючы» арсенал мастацкіх сродкаў. Нестае кнізе таго аналізу, які С. Эйзенштэйн называў аналізам «буйным планам», калі «механізм твора» вывучаецца з такой жа самай падрабязнасцю, як гэта робяць у тэхніцы, вывучаючы новую канструкцыю. Паўтараю, аўтары часцей за ўсё называюць і пералічваюць вартасці або недахопы твораў, робяць гэта на многіх старонках, не вельмі паглыбляючыся ў методыку і стылістыку працы асобных рэжысёраў.

Сапраўднае мастацтва, застаючыся «прадуктам сваёй эпохі», не баіцца самага патрабавальнага аналізу. І лепшыя творы беларускага кінематографа, якія прайшлі АТК часу, сведчаць аб гэтым. Было б добра, калі б у гістарычным аглядзе на гэтым быў зроблены больш выразны акцэнт.

Мне здаецца, што калі чыста гісторыяграфічны бок кнігі распрацаваны з дастатковай паўнатой, то пытанні тэорыі беларускай кінадраматургіі, асаблівасцей рэжысёрскай інтэрпрэтацыі і стылістыкі (апрача, бадай, нарыса пра У. Корш-Сабліна), як і праблемы экранізацыі літаратуры, распрацаваны пакуль што недастаткова глыбока. Ды і расказ аб шляхах развіцця беларускага дакументальнага кіно, аб слаўнай яго ролі ў стварэнні экраннага летапісу рэспублікі — адзін з моцных бакоў кнігі — празмерна перагружаны фактагогіяй (нарыс ваеннага перыяду) і яму таксама, на маю думку, не хапае прафесіянальнага аналізу і тэарэтычных абагульненняў.

Паўтараю, першая частка «Гісторыі беларускага кіно» пакідае агульнае добрае ўражанне — яна напісана аўтарамі, якія ведаюць прадмет даследавання, скрупулёзна вывучылі факты і працы ў гэтай галіне сваіх папярэднікаў. Што ж датычыць маіх крытычных заўваг, дык гэта, мабыць, бывае заўсёды, калі чытаеш цікавае і змястоўнае даследаванне і раптам бачыш, што аўтары не заўсёды і не ўсюды ўтрымаліся на ўзроўні лепшых старонак і раздзелаў,—хочацца абавязкова падзяліцца сваімі назіраннямі. А кніга заслугоўвае ўвагі шматлікіх аматараў кіно, сталых прыхільнікаў гэтага мастацтва і яго практыкаў. Кіназнаўцы А. Красінскі, В. Смаль, В. Нячай, Г. Ратнікаў і Г. Падбярэзскі зрабілі патрэбны крок у галіне пашырэння нашых ведаў пра самае масавае мастацтва, любімае мільёнамі.

Э. МІЛОВА.

«Гісторыя беларускага кіно». Першая частка. 1924—1945 гады. Калектыў аўтараў. На рускай мове. Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск, 1969 г.

БЯССМЕРЦЕ СУЛЕЙМАНА

Споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Дагестана Сулеймана Стальскага...

У 1937 годзе ў вершы «Памяці дагестанскага ашуга Сулеймана Стальскага» Янка Купала пісаў:

У краіне гордай, горы дзе пад неба,
Дзе быў прыкаваны Праметэй да скалы,
Рос і гадаваўся у бядзе, без хлеба
Сулейман гаротны, наш пясняр удалы.

Гналі, высмявалі багачы і князі, —
Яго песні-думы былі ім не мілы.
У сваім ауле з гора не вылазіў,
У бядняцкай саклі шчасце не гасціла.

Ды мінулі годы
Ведаў і кайданаў,
Прыйшла радасць, воля
Ў хату Сулеймана.

Песні яго ў людзі
Выйшлі гулка, дзіўна.—
Ўдаўся у ашуга
Голас салаўіны.

У гэтых купалаўскіх радках — і жыццё, і сам паэтычны лёс выдатнага дагестанскага ашуга...

Сулейман Стальскі нарадзіўся 18 мая 1869 года ў невялічкім дагестанскім ауле Ашага-Стал. Рана страціўшы бацькоў, Сулейман ужо ў трынаццаць гадоў вымушаны быў пайсці на ўласны хлеб — батраком да багатага садавода. Пасля ён працаваў на англійскіх плантацыях, чорнарабочым у Самаркандскім дэпо, на будаўніцтве моста праз Сыр-Дар'ю, на бакінскіх нафтапромыслах. Дзе тут было думаць аб вучобе! Сулейман на ўсё жыццё так і застаўся непісьменным. Лёс яго быў такі ж, як і лёс многіх іншых сыноў бядняцкіх горскіх аулаў.

Але надышоў Вялікі Кастрычнік. Непісьменны ашуг хутчэй сэрцам гаротніка-бедняка адчуў, чым зразумеў, што менавіта Кастрычніцкая рэвалюцыя нясе вызваленне працоўнаму люду, што разам са святлом ленінскай праўды прыходзіць святло і шчасце ў саклю горца.

Пазней Сулейман Стальскі скажа: «Бальшавіцкае землетрасенне перавярнула... стары свет, і вяршыні нашых шматпакутных гор і нашы прасторы асвятліліся яркім полымем Вялікага Кастрычніка... Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя прыгнечаным дала свабоду, бяскрылым — магутныя крылы, сляпым — зрок, тым, хто стагнаў, праліваў горкія слёзы, — шчаслівае, радаснае жыццё...»

Гэта ён мог сказаць і пра сябе. Менавіта Вялікі Кастрычнік акрыліў песню паэта-імправізатара, даў ёй волю і магутныя крылы. І песня гэтая загучала не толькі на ўвесь родны край паэта, але і далёка за яго межамі.

Менавіта ў Савецкай уладзе Сулейман Стальскі знайшоў для сябе вялікую ісціну, што людзі на зямлі — браты. Ён гаварыў: «Я паэт не лезгінскі і не каўказскі, — я савецкі паэт, хоць і спяваю я толькі на сваёй мове». Ён спяваў натхнёны гімн вялікай савецкай Радзіме, партыі, народу, славіў слаўную Чырвоную Армію, камсамол, вольнае і шчаслівае жыццё. Яго мудрае слова, яго самабытны голас суладна гучаў у магутным хоры шматмоўнай савецкай паэзіі

У 1934 годзе Сулейману Стальскаму было нададзена ганаровае званне народнага паэта Дагестана. У гэтым жа годзе стары ашуг быў дэлегатам І з'езда савецкіх пісьменнікаў, сустракаўся і гутарыў з Максімам Горкім. У заключнай прамове на з'ездзе Максім Горкі гаварыў: «Я звяртаюся з сяброўскай парадай, якую можна зразумець як просьбу, да прадстаўнікоў нацыянальнасцей Каўказа і Сярэдняй Азіі. На мяне, і я ведаю, не толькі на мяне, аказаў велізарнае ўражанне ашуг Сулейман Стальскі. Я бачыў, як гэты стары, непісьменны, але мудры, седзячы ў прэзідыуме, шаптаў, ствараючы свае вершы, затым ён, Гамер XX стагоддзя, цудоўна прачытаў іх. Беражыце людзей, якія ўмеюць ствараць такія перлы паэзіі, якія стварае Сулейман».

Так, непісьменны дагестанскі ашуг ствараў сапраўдныя перлы паэзіі. І яны не пабляклі ад часу. Сёння, калі савецкая краіна адзначае 100-годдзе з дня нараджэння народнага паэта Дагестана, мы бачым, што мудрае слова Сулеймана жыве ў народзе, што жыве яго маладая паэзія, якая ўвасобіла ў сабе многія істотнейшыя рысы эпохі.

Яны афармляюць нашы кнігі

ЛАКАНІЗМ, ГАРМОНІЯ, ЦЭЛЬНАСЦЬ

Мікалай Шырокаў — удумлівы, сур'ёзны канструктар кнігі. У лепшых выданнях, афармленых ім, — высокая культура графічнага выканання. Аднолькава ўважліва ставіцца ён і да твора мастацкай літаратуры, і да навуковай кнігі, і да брашуры. У кожным выданні імкнецца стварыць «вобраз кнігі», апрануць кнігу ў такі «ўбор», які адпавядаў бы яе ўнутранаму ладу.

Характэрная асаблівасць графічнай манеры М. Шырокава — лаканізм выяўленчых сродкаў, канструктыўнасць прасторавых і кампазіцыйных элементаў. Графік тонка разумее спецыфіку мастацтва кнігі. Кампазіцыі яго пераканаўчыя і рытмічныя, ён умела інтэніруе шрыфтамі і іншымі графічнымі сродкамі, надаючы кнізе патрэбнае аблічча.

Так, афармляючы шасцітомнае выданне збору твораў Янкі Купалы, мастак выносіць на пераплёт толькі імя аўтара. Ён будуе яго двухрадкоўем, асіметрычна. Чорны колер літар выразнага, яснага рысунка, крутога кегля на цёмна-шэрым агульным фоне гучыць сакавіта. Такі ж надпіс на «нарашку», дэкарыраваны сціплым геаметрычным арнаментам.

Лаканічна і арыгінальна аформіў М. Шырокаў чатырохтомнік твораў Я. Брыля. Ён зыходзіць тут з класічнага прынцыпу сіметрыі. Праўда, надпіс крыху завышаны. Скупыя выяўленчыя элементы супера і пераплёта гарманіруюць з дэкаратыўным форзацам, разгорнутым тытулам. Элементы аздаблення зведзены да мінімуму. Спакойная колерная варыяцыя, умелае размеркаванне шрыфту на суперы, пераплёце, тытуле і невялікія дэкаратыўныя дэталі складаюць завершанае кампазіцыйнае цэлае.

М. Шырокаву ўвогуле ўласціва гранічная эканомія графічна-выяўленчых сродкаў. Вось і ў афармленні кнігі польскага паэта У. Бранеўскага «Дарогай дзён» максімальная выразнасць дасягнута за кошт лаканізму. Агульны фон — чырвона-аранжавы з дэкаратыўным шрыфтам. Тытул вырашаецца на кантрастах, якія парушаюць традыцыйныя законы сіметрыі. Супастаўленне колераў (чорны і аранжава-чырвоны на белым фоне) робіць кампазіцыю тытула дынамічнай.

Мастак любіць манеўраваць памерам і формай шрыфту, яго пабудовай, даўжынёй радкоў, прасторай. Вось, напрыклад, кніга Б. Смольскага «Беларускі дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета». Каб найбольш рацыянальна размясціць такі доўгі надпіс на вокладцы, М. Шырокаў выбірае дэкаратыўна-рублены шрыфт — светла-шэры на белым фоне. Надпіс вырашаецца на блочнай сістэме ў восем радкоў (слова пад словам). Форма шрыфту, яго колерная камбінацыя надаюць кампазіцыі пэўнае сэнсавае адценне.

А кольні вынаходлівасці патрабуе ад мастака афармленне тэхнічнай літаратуры! «Даведнік электрыка» і «Электрычныя станцыі і падстанцыі», афармленыя М. Шырокавым, вылучаюцца пэўным стылем, уласцівым такога роду выданням.

М. Шырокаў стварае кнігі вельмі розныя і па тэмах, і па мастацкіх рашэннях. Але ў яго няма кнігі, «апранутай» наспех. Вазьміце хоць бы каталог «Кнігі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі». Тут сама спецыфіка выдання падказала мастаку рашэнне. Актыўна скарыстаны не толькі выяўленчыя элементы (малюнак шрыфту, кампазіцыйнае яго размяшчэнне, колер), але і невыяўленчыя (якасць паперы, фармат і г. д.).

М. Шырокаў шмат гадоў працуе ў выдавецтве «Беларусь» мастацкім рэдактарам. Яго смела можна назваць «рэжысёрам» кнігі. Разам з мастаком ён нястомна працуе над стварэннем мастацкага вобраза будучага выдання. Прыкладам могуць служыць многія і многія кнігі, дыпламаваныя на ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах на лепшае мастацкае афармленне і паліграфічнае выкананне. Нямала творчай волі ўкладзена М. Шырокавым у такія выданні, як «Выбраныя творы» Я. Купалы (мастак Б. Забораў), «Заўсёды з Леніным» П. Броўкі (мастак І. Давідовіч), зборнік «Дзень паэзіі» (мастак Б. Забораў), «Рудабельская рэспубліка» С. Грахоўскага (мастак Ул. Круглоў) і іншыя.

Кожны новы рукапіс, які трапляе да М. Шырокава, — штуршок да новага пошуку. А пошук выяўляе ўсё новыя грані таленту мастака.

Цяпер ён заняты мастацкім вырашэннем такіх розных выданняў, як даведнік «Пісьменнікі Савецкай Беларусі», даследаванне Б. Гарта «Фартэпіянныя творы беларускіх кампазітараў у школьным рэпертуары», кніга літаратуразнаўцы Д. Бугаёва «Шматграннасць».

Патрабавальнасць мастака да сябе — лепшая зарука таго, што нам прыемна будзе ўзяць у рукі гэтыя кнігі.

В. ЦЕРАШЧАТАВА.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Алесь Пальчэўскі. Таемная крушня. Апавяданні. Мастак В. Тарасаў. 1969 г. Тыраж 10.000 экз. 256 стар. Цана 60 кап.

С. Пачанін. У навальнічным васемнаццатым. Мемуары. Мастак А. Андрыянаў. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 4.000 экз. 352 стар. Цана 87 кап.

Піянеры-героі. Зборнік. Складальнікі: В. Зуёнак, А. Рокаш, П. Ткачоў. Мастакі І. Бялацкі, Ю. Пучынскі. На рускай мове. 1968 г. Тыраж 100.000 экз. 304 стар. Цана 49 кап.

Анатоль Сабалеўскі. Беларуская савецкая драма. Кніга першая. Мастак В. Харэўскі. 1969 г. Тыраж 4.000 экз. 152 стар Цана 48 кап.

Іван Шамякін. Сэрца на далоні. Беларускі раман Мастак А. Кашкурэвіч. 1969 г. Тыраж 35.000 экз. 496 стар. Цана 99 кап.

Рыгор Шкраба. Літаратура і мова. Кніга пра майстэрства. Афармленне В. Жыжэнні. 1969 г. Тыраж 1.600 экз. 320 стар. Цана 66 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАВУКА І ТЭХНІКА»

Р. Булацкі. Першыя рабселькоры Беларусі. (Аб вытоках рабселькораўскага руху ў рэспубліцы). На рускай мове. 1969 г. Тыраж 2.700 экз. 192 стар. Цана 41 кап.

Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры ў двух тамах. Том 2. Літаратура XIX—пачатку XX ст. Мастак І. Славянін. 1969 г. Тыраж 4.700 экз. 620 стар. Цана 2 руб. 42 кап.

М. Грынчык. Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі. Мастак Ю. Сергачоў. 1969 г. Тыраж 1.000 экз. 296 стар. Цана 1 руб. 14 кап.

Гісторыя беларускага кіно. 1924—1945 гг. Мастак Ю. Сергачоў. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 1.250 экз. 240 стар. Цана 98 кап.

К. Кабашнікаў. Ад традыцыйнага фальклору да рэвалюцыйнай паэзіі. Мастак Ю. Сергачоў. 1969 г. Тыраж 1.050 экз. 180 стар. Цана 58 кап.

СПАДАРОЖНІК ДЛЯ КОЖНАГА

Дзяржаўны мастацкі музей БССР па праве ганарыцца сваімі калекцыямі твораў выяўленчага мастацтва. Адзін з каштоўнейшых сярод гэтых збораў — той, які мы прывыклі бачыць у залах другога паверха: рускае і беларускае мастацтва XVIII—пачатку XX стагоддзяў. В. Сяроў і К. Каровін, А. Архіпаў і М. Несцераў, М. Рэрых і Ф. Малявін, З. Серабракова і В. Бялыніцкі-Біруля... З гэтымі і многімі-многімі іншымі не менш слаўнымі мастакамі знаёмімся мы ў нашым музеі па іх арыгінальных творах.

Цяпер наша знаёмства становіцца больш грунтоўным—мы маем каталог-пуцеводзіцель па гэтай калекцыі музея. Яго склалі Р. Бадзін, Н. Бараноўская, П. Герасімовіч, А. Рэсіна — навуковыя супрацоўнікі музея.

У каталогу ёсць аглядныя артыкулы аб кожным з падраздзелаў экспазіцыі, лаканічныя звесткі аб творах і біяграфічныя даведкі аб мастаках. Дзе гэта было магчыма, пададзены таксама звесткі аб удзеле мастакоў у выстаўках.

Трэба сказаць, што такое грунтоўнае апісанне музейнай калекцыі зроблена ўпершыню. Яно заснавана на глыбокім вывучэнні калекцыі, у выніку якога ўдалося даставаць многія творы, удакладніць іх назвы і аўтараў, а таксама ўстанавіць іншыя звесткі пра творы.

Знаёмячыся з каталогам, мы быццам ідзём па залах музея. Якасна выкананыя рэпрадукцыі ўзбагачаюць тэкст. Арыентавацца ў каталозе памагае алфавітны спіс мастакоў.

Выданне разлічана на шырокага гледача і на спецыялістаў-мастацтвазнаўцаў. Каталог можа быць скарыстаны наведвальнікам музея і ў час прагляду экспазіцыі, і для папярэдняга знаёмства.

Аматары выяўленчага мастацтва знойдуць тут самыя неабходныя звесткі пра айчынны партрэтны і пейзажны жывапіс XVIII стагоддзя, пра развіццё гістарычнага жанру ў эпоху панавання класіцызму, аб пашырэнні рэалістычных тэндэнцый на розных этапах айчыннага мастацтва ў XIX стагоддзі і па іншых пытаннях. Тут ёсць кампактныя каментарыі да творчасці амаль кожнага з прадстаўленых у экспазіцыі мастакоў. Падаюцца дакладныя звесткі пра творы мастакоў — выхадцаў з Беларусі і тых, чыя творчасць звязана з Беларуссю (такіх, напрыклад, як І. Аляшкевіч і А. Гараўскі, С. Заранка і С. Жукоўскі, Ф. Рушчыц і Ф. Хадаровіч). Пэўныя акцэнты зроблены на творах, прысвечаных вядомымі рускімі мастакамі жыццю беларускага народа і беларускаму краю (І. Рэпін, І. Шышкін і інш.).

Аўтары каталога звяртаюць асаблівую ўвагу на тыя творы калекцыі, якія для сённяшняга гледача патрабуюць пэўных каментарыяў (напрыклад, партрэт цэсарэўны Анны Пятроўны работы невядомага мастака пачатку XVIII стагоддзя, «Смерць Адоніса» А. Ласенкі, «Ахілес аплаквае цела Патрокла» М. Ге, «Цар Іван IV Грозны просіць Ігумена Кірыла блаславіць яго ў манахі» К. Лебедзева).

У межах магчымасцей, якія дае прыняты ў каталогах стыль выкладання матэрыялу, прыведзены лаканічныя ацэнкі асобных твораў, зроблены заўвагі аб асаблівасцях індывідуальнага творчага почырку тых ці іншых жывапісцаў і скульптараў.

На жаль, каталог здолеюць набыць усяго толькі шэсць тысяч наведвальнікаў музея — такі мізэрны яго тыраж.

Ул. БРЫГ.

Дзяржаўны мастацкі музей БССР. Каталог-пуцеводзіцель. Рускае і беларускае мастацтва XVIII—пачатку XX стагоддзя. (На рускай мове). «Художник РСФСР». Ленінград. 1968.

«ПАЎЛІНКА» НА СЦЭНЕ НАРОДНАГА

Калектыў народнага тэатра Палаца культуры Магілёўскага завода штучнага валакна паставіў спектакль па камедыі Янкі Купалы «Паўлінка». Рэжысёр В. Ермаловіч, афармленне мастака В. Акулава, песні падрыхтаваны В. Аржаноўскай, танцы паставіла Э. Кіракозава.

У спектаклі заняты ўвесь творчы састаў Народнага тэатра.

У галоўных ролях выступаюць І. Глямжа (Сцяпан Крыніцкі), В. Бабровіч (Альжбета), Н. Бутовіч (Агата), М. Яфрэменка (Пранцысь Пустарэвіч), А. Парфененка (Адольф Быкоўскі) і іншыя.

На здымку — сцэна са спектакля. У ролі Паўлінкі (у цэнтры) В. Рудкоўская.

КІНО

ЧАЛАВЕК У РАШАЮЧУЮ ГАДЗІНУ

НАТАТКІ АБ НОВЫХ САВЕЦКІХ ФІЛЬМАХ

ВА ЎСІХ фільмах, аб якіх пойдзе гаворка,— у карціне «На вайне, як на вайне» ленінградцаў Віктара Трагубовіча і Віктара Курачкіна, і ва ўкраінскай «Аннычцы» Барыса Іўчанкі і Барыса Загарулькі, а таксама ў карціне «Стрэл на перавале», створанай па матывах аднайменнай аповесці пісьменніка Мухтара Аўэзава кіргізскім рэжысёрам Болатам Шамшыевым (студыі «Кіргізфільм» і «Казахфільм»), — герой аказваецца ў такіх жыццёвых абставінах, якія патрабуюць ад яго рашучага дзеяння, якое вызначае яго лёс (ды і не толькі яго).

Былы калгасны трактарыст, потым курсант ваеннага вучылішча, а цяпер камандзір экіпажа Саня Малешкін («На вайне, як на вайне») трапляе ў сітуацыю крытычную: у момант атакі на варожыя пазіцыі яго самаходка раптам спыняецца — вадзіцель не можа выйсці з нервовага шоку і націснуць на рычаг кіравання. А машыне трэба ісці далей, наперарэз фашысцкім танкам. І тады Малешкін выскоквае з яе і прымушае рухацца за сабой, паказваючы дарогу вадзіцелю. Ён не ведае страху і быццам не чуе аглушальнага грукату гармат, ён ведае толькі адно: машына павінна ісці наперад, у бой.

Гераізм Сані Малешкіна не ўспрымаецца намі як нешта непрадбачанае — мы не здзіўляемся рашучасці Сані, які, не раздумваючы, кідаецца пад агонь праціўніка, — для героя гэта натуральны крок, глядач падрыхтаваны да яго развіццём характару, самым ходам фільма.

А пачынаецца карціна, здавалася б, у іншым ключы, чым той, што павінен увесці ў атмасферу вайны, у абстаноўку цяжкіх баёў. Спачатку аўтары падрабязна і нетаропка паказваюць нам ваенны быт, знаёмяць з тымі, хто раскрыецца гледачу ў прастаце і велічы аднаасова, у высокім патрыятычным парыванні.

У цэнтры карціны — баявы экіпаж самаходкі, яго камандзір Саня Малешкін (у вельмі добрым выкананні Міхаіла Конанава), яфрэйтар Бянкін (Фёдар Адзінокаў), старшына Шчарбак (Віктар Паўлаў), сержант Міша Дамешак (Алег Барысаў). Жывыя чалавечыя партрэты створаны аўтарамі з павагай і любоўю. І людзі на экране выклікаюць шчырую прыхільнасць, а галоўнае — глыбокую веру ў іх вернасць Радзіме, у іх самаадданасць, сілу духу. Аўтары не баяцца лёгкіх іранічных фарбаў у характарыстыцы сваіх герояў, але ж асноўную задачу бачаць у тым, каб выявіць у гэтых простых хлопцах адданасць высокім мэтам, паказаць прыгажосць іх ваеннага подзвігу. І тады, калі наступае рашаючы для герояў карціны час, фільм перастае быць для нас толькі апавядальна-бытавой стужкай, ён узнімаецца на новую ступень, набывае гераічнае гучанне.

...Адчаянным гераічным парываннем Аннычкі, дзяўчыны з гуцульскай вёскі, завяршаюць сваю карціну ўкраінскія кінематаграфісты. На ўрачыста-трагічнай ноце абрываецца фільм, у якім пераплятаюцца розныя жанравыя матывы — і сацыяльна-псіхалагічная драма, і рамантычная паэма, і народнае дзеянне. І зноў жа гэты фільм з'яўляецца заканамерным вынікам руху цэнтральнага характару. У Аннычкі — натуры гордай, незалежнай — ёсць свая праўда, не падобная да той, якой трымаецца яе бацька, багаты селянін. Яна не можа пераступіць законы чалавечнасці, сумленнасці, справядлівасці. І не можа пагадзіцца, калі гэтыя законы парушаюцца груба і гвалтоўна. Вось чаму барацьба Аннычкі за жыццё і свабоду партызана Андрэя, з якім яе звязала вялікае пачуццё, прадыктавана не толькі асабістымі матывамі. Яна набывае куды больш шырокі, сацыяльны, палітычны сэнс. Становіцца барацьбой супраць фашызму.

Трэба ўспомніць вочы Аннычкі, яе іграе Любоў Румянцава, што свецяцца болем і гневам, калі яна вымушана быць сведкай садысцкіх здзекаў з партызан, а потым іх расстрэлу. А выпрабаванне сапраўды страшнае: людзі павінны ступаць па бітым шкле, танцаваць на ім. Ходзіць па крузе, разбіваючы адну за другой бутэлькі, фашысцкі служка, усміхаецца падлаватай усмешкай, наперад смакуючы жорсткае відовішча. Хрусціць пад ботамі шкло... І вось ужо малады прыгажун Іванка робіць першыя крокі ў танцы, а праз мінуту варожая куля прабівае яму грудзі.

Потым будзе яшчэ адзін танец — на вяселлі Аннычкі, якое яна наладзіла, каб выратаваць з палону Андрэя. Увойдуць у круг Аннычка і яе жаніх, паліцай Раман, ступяць на чарапкі посуду, што па старадаўнім народным звычаі кідаюць пад ногі маладым, заіграе музыка, але яе гукі заглушыць хруст асколкаў, ён нагадае аб ранейшым танцы пакарання смерцю...

Бадай, у гэтых дзвюх, самых моцных сцэнах фільма і заключаны яго пафас — любоў да чалавека і нянавісць да яго прыгнятальнікаў.

Мастацкі лад «Аннычкі» абапіраецца на народны фальклор, народную паэзію, гэта не проста «нацыянальны каларыт», гэта выказванне нацыянальнай самабытнасці, нацыянальнага духу народа.

Ярка выказаная нацыянальная своеасаблівасць уласцівая і карціне «Стрэл на перавале», дзеянне якой пераносіць гледача ў перадрэвалюцыйнае Сямірэчча, сутыкае з перапляценнем класавых, нацыянальных, псіхалагічных і іншых канфліктаў.

У цэнтры фільма — бядняк Бахтыгул і багацей Жарасбай. Аднак менш за ўсё аўтары схільны да прымітыўнага кантрасту: дрэнны — добры. Яны стараюцца абмаляваць герояў ва ўсёй іх чалавечай паўнаце, складанасці. Бахтыгулу не адмовіш не толькі ў смеласці, мужнасці, тэмпераментным напоры пачуццяў, але і ў розуме, вольналюбстве, самастойнасці натуры. Незвычайнасць гэтага чалавека, горды парыў яго стыхіі цудоўна перадае Сюйменкул Чакмароў (дарэчы, непрафесіянальны артыст, кіргізскі мастак). І Жарасбай (роля гэтая таксама выдатная работа С. Чжумадылава) прыцягвае да сябе сілай, цэльнасцю асобы. Хітры, няверны, палітыканствуючы, ён нідзе не зводзіцца аўтарам да чалавека, якога адольваюць дробныя страсці. Жарасбай іграе «буйна». І калі і памыляецца ў чым-небудзь, дык толькі не ў галоўным — не ў сваім становішчы і ўладзе.

І ўсё ж Жарасбай прыходзіць да непазбежнага для сябе, трагічнага канца. Бахтыгул, які звярнуўся да яго — ён займае пасаду валаснога, — каб ён абараніў ад багацея Сальмена, які супернічае з ім, пачынае служыць гаспадару, як кажуць, верай і праўдай: арганізоўвае набегі на конскія табуны Сальмена, дапамагае Жарасбаю ў перадвыбарчай кампаніі. Але Жарасбай здраджвае свайму памочніку — ён лёгка ахвяруе ім, калі гэтага патрабуюць абставіны. Ці можа дараваць Бахтыгул гэтую здраду. Цяпер ён многае разумее. З вінтоўкай у руках Бахтыгул чакае Жарасбая на горным перавале і пасылае ў яго трапную кулю...

Але гэта не простая асабістая помста. У гэтым і ёсць значэнне карціны, аўтары якой здолелі паказаць шлях героя да «перавалу», да ўсведамлення сацыяльнай няроўнасці і неабходнасці класавай барацьбы. У гэтым унутраным пераломе — ідэйны сэнс фільма, які раскрывае дыялектычныя сувязі чалавечага, народнага лёсу з ходам гісторыі.

Ніна ІГНАЦЬЕВА,
кінакрытык (АДН).

Помнікі нашага краю

КРЭЎСКІ ЗАМАК

Крэва... Паселішча на старажытнай стратэгічнай дарозе паміж Вільняй, Менскам і Масквой. Адзін з першых па значэнні гарадоў Вялікага Княства Літоўскага. Крэва было цэнтрам даволі моцнага ўдзельнага княства, часта ўпаміналася летапісцамі. Шмат пра яго пісалася і ў беларускіх, літоўскіх, польскіх, рускіх, і нават нямецкіх хроніках.

Прыкладна ў сярэдзіне XIV стагоддзя тут была вымуравана вялізная крэпасць-замак абарончага значэння. Замак стаяў у лагчыне, не меў пад сабой насыпной гары. Ён быў абведзены ровам з вадой. Гэта павялічвала яго абарончае значэнне. Ваду давалі дзве маленькія рэчкі: Крэўка і яе прыток Шляхцянка. На Шляхцянцы была збудавана спецыяльная плаціна.

І ўсё ж водны рубеж быў слабаватым, яго можна было фарсіраваць з ходу і аказацца перад самымі сценамі крэпасці. Вежы замка, хоць і грозныя на выгляд, з баку таксама не абараняліся. Прыступнымі здаваліся і вароты замка. Устаяць супраць ворага нават пры тагачасных аблогах было цяжка.

Калі цяпер прыгледзецца да сцен замка, то ўбачыш, што яны амаль цалкам вымураваны з каменяў і абліцаваны цэглай. Таўшчыня іх была 4 сажні, вышыня — 6. Даўжыня сцен крэпасці — 50, шырыня — 40 сажняў (паводле абмераў Віленскага археолага Ф. Пакроўскага, зробленых у 1893 годзе).

У паўночна-заходнім рагу замка захаваліся руіны чатырохкутнай, амаль квадратнай вежы. Па скляпеннях і дзірках для бэлек можна меркаваць, што гэта была чатырохпавярховая вежа. Ва ўцалелых сценах па два гатычных акны-стрэльніцы. Каля ўсходняй сцяны ёсць напаўзасыпаны спуск у падзямелле, а можа і ў падземны ход. Праўда, пра тое, быў ён ці не, спрэчкі не змаўкаюць па сённяшні дзень.

Што ён быў — даказваў археолаг Пакроўскаму ў мінулым стагоддзі тутэйшы жыхар Абрам Рубінштэйн. Неяк ён капаў яму для піўнога склепа і наткнуўся на каменнае скляпенне. З прабітай адтуліны з шумам вырвалася сціснутае ўдушлівае паветра. Гэта было ў 25 сажнях (каля 53 метраў) ад замка ў кірунку гарадзішча. Другі жыхар — Нахман Эпштэйн, тлумачыў, што капаючы пад сваім домам падвал, таксама наткнуўся на падземны праход у тым жа кірунку. Усё зводзілася да доказу, што праход быў і выходзіў недзе на гарадзішчы, у двух кіламетрах ад замка.



Так яны выглядаюць, руіны Крэўскага замка-крэпасці на Смаргоншчыне.

Зараз за сценамі замка не захавалася ніякіх пабудоў. Мяркуецца, што самыя апошнія з іх, калі Крэва страціла сваё палітычнае значэнне, былі драўляныя. А што пабудовы былі ўсякія, гэта бясспрэчна. Цяжка ўявіць, што ў невялікай, хоць і чатырохпавярховай, вежы маглі змяшчацца князь з вялікай дружынай і іншы люд.

Замак бурыўся пад ударамі ворагаў. Асаблівую шкоду збудаванню прынеслі татары. Потым былі спробы аднавіць замак, адзін час тут нават жыў вядомы князь Курбскі.

Моцна пашкодзілі замак і апошнія войны. У імперыялістычную вайну тут праходзіла лінія фронту. Сцены замка разбіраліся для інжынерных ваенных збудаванняў. Гэтак жа былі амаль поўнасцю разабраны больш даступныя сцены суседняга Беніцкага замчышча.

...З гары ля Лоска, з былога замчышча Крэўскі замак добра відаць. Ён ўяўляе сабою крыху няправільны чатырохкутнік. Нават здалёк гэты выдатны помнік архітэктуры ўражвае сваёй веліччу.

Г. КАХАНОЎСКІ,
намеснік дырэктара па навуковай рабоце Мінскага абласнога краязнаўчага музея.

Госці МІНСКА

ГУЧЫЦЬ ФРАНЦУЗСКАЯ МУЗЫКА

Праграма канцэрта французскага спевака Жэрара Сузея, які адбыўся 17 мая ў зале філармоніі, складалася з твораў або зусім невядомых, або — за выключэннем песень Франца Шуберта і некаторых рамансаў Рыхарда Штрауса — з такіх, якія рэдка выконваліся на нашых канцэртных эстрадах. Мабыць, наш госць меў пэўную мэту — пазнаёміць слухачоў з творамі французскай музыкі розных школ і эпох, ад Люлі да Дэбюсі, Дзюпарка і Пуленка.

Вакальная музыка вялікага французскага кампазітара XVII стагоддзя Жана-Баціста Люлі амаль не гучыць у нас на беларускай канцэртнай эстрадзе (адзінае, што мы слухаем з вакальнай музыкі Люлі, — гэта арыя Ларэты з оперы «Рычард — Львінае сэрца», якую спявае... старая графіня ў «Пікавай даме» Чайкоўскага). Рэдка выконваюцца ў нас і вакальныя творы Дэбюсі, Дзюпарка і Пуленка.

Ж. Сузей пачаў свой канцэрт выкананнем арыі Карона з оперы «Альцэста», Кадмуса з оперы «Кадмус і Герміёна» і Балета з оперы «Рафіна» Жана-Баціста Люлі. Нягледзячы на «камернасць» выканання оперных арый, цудоўная старадаўняя вакальная музыка прагучала пераканаўча. У Жэрара Сузея прыемны барытон і разнастайная палітра тэмбравых і дынамічных адценняў.

Спявак вельмі добра адчувае гумарыстычныя і жанравыя адценні вакальнага цыкла Фрэнсіса Пуленка «Сельскія песні». Трэба сказаць, што ў гэтым цыкле адчуваецца яўны ўплыў вялікага рускага кампазітара Мусаргскага, якім усё жыццё захапляўся Пуленк. Музыка цыкла свежая і гарманічная, якая шчодра дапаўняе і ўзбагачае вакальную мелодыю. Другі вакальны цыкл «Прагулка двух закаханых» Клода Дэбюсі на словы Трыстана Лерміта — гэта ўзор сталага, адточанага кампазітарскага майстэрства. Цыкл вельмі цікавы і можа быць прыкладам майстэрства музычнай дэкламацыі, разлічанай на выкананне твораў на французскай мове. Трэці, апошні раманс цыкла — «Я ўзрушаны, калі бачу твой твар» — належыць да лепшых вакальных твораў Клода Дэбюсі. Ён вельмі непасрэдны, мелодыя пластычная і выразная, гармонія хоць і вельмі простая, але не прымітыўная, а хутчэй ювелірна тонка распрацаваная. Жэрар Сузей па-майстэрску карыстаецца сродкамі музычнай дэкламацыі Дэбюсі.

На жаль, у песнях Франца Шуберта, выкананых на добрай нямецкай мове, Жэрару Сузею яўна неставала «шубертаўскай» экзальтацыі, усхваляванасці і захаплення, асабліва ў песні «Нецярпенне». Бракавала і глыбіні драматычнай патэтыкі ў славутым «Двайніку». Відаць, пакуль што рамантызм Шуберта з'яўляецца тэра інкогніта для французскага спевака.

Затое рамансы другога аўстрыйскага кампазітара Рыхарда Штрауса прагучалі на высокім выканаўчым узроўні.

На «бis» Жэрар Сузей праспяваў некалькі твораў, сярод якіх музычным прывітаннем слухачам была «Серанада дон Жуана» Чайкоўскага, выкананая на рускай мове. Вось яшчэ адзін прыклад увагі артыста да сваёй дыкцыі, яго артыстычнай адказнасці перад слухачамі: хоць вымаўленне яго з акцэнтам, кожнае слова даходзіла да слухача ва ўсёй маляўнічасці і багацці зместу.

Поспех гастралёра па праве падзяліў добры і чуйны акампаніятар Дальтон Болдуін.

Анатоль Цыркуноў.

СКУЛЬПТУРНАЯ ГАЛЕРЭЯ АЎТАЗАВОДЦА

А адразу пасля вайны Канстанцін Гелашвілі звязаў сваё жыццё з Мінскім аўтамабільным заводам. Ён і цяпер працуе тут. А «хобі» Канстанціна Дзяменцьевіча — скульптура. За восем гадоў работы ён стварыў скульптурныя партрэты У. І. Леніна, Н. К. Крупскай, Ф. Э. Дзяржынскага, старога бальшавіка П. А. Папова, нашых праслаўленых касманаўтаў — Юрыя Гагарына, Валянціны Церашковай, Германа Цітова, Андрыяна Нікалаева і многія іншыя.

На здымку — К. Гелашвілі працуе над кампазіцыяй «Прызнанне».

Фота Ул. КІТАСА.

ПАЎСТАГОДДЗЯ НАД РУКАПІСАМІ ТАЛСТОГА

180 ТЫСЯЧ аркушаў складае рукапісная спадчына Л. М. Талстога. Ці можна іх прачытаць і вывучыць? Ёсць людзі, якія на гэта адважыліся. У іх ліку — Уладзімір Аляксандравіч Жданаў і яго жонка Эвеліна Яфімаўна. Яны — аўтары работ, прысвечаных творчай гісторыі «Вайны і міру», «Анны Карэнінай», «Уваскрэсення» і іншых твораў. Рукапісам Талстога муж і жонка прысвяцілі, можна сказаць, усё жыццё — каб іх прачытаць і вывучыць, ім спатрэбілася пяцьдзесят гадоў.

— Няхай не здасца парадаксальным, але для нас гэта задавальненне, — кажуць вучоныя. — Сачыць за ходам думкі, нечаканымі паваротамі творчага ўяўлення мастака, ды яшчэ такога, як Талстой,—што можа быць больш захапляючае! Больш таго, мы проста сумуем, калі не працуем над рукапісамі.

— А што ж усё-такі гэта такое, «работа над рукапісамі»? — пытаюся я.

Эвеліна Яфімаўна тлумачыць так:

— У маладосці Талстой гаварыў: «Трэба назаўсёды адкінуць думку пісаць без паправак. Тры, чатыры разы — гэта яшчэ мала». Так ён лічыў у 1852 годзе. А праз 35 гадоў аўтар «Вайны і міру» раіў: «Трэба, галоўнае, не спяшацца пісаць, не сумаваць папраўляць, перарабляць дзесяць, дваццаць разоў адно і тое ж».

Пісьменнік іменна так і рабіў. А наша задача — вывучэнне, скрупулёзны аналіз тысяч і тысяч аркушаў паправак і варыянтаў рукапісаў — ад першага да апошняга—да таго, каб прасачыць творчы працэс, «біяграфію» таго ці іншага твора. Другая мэта — старанная выверка памылак перапісчыкаў, наборшчыкаў, якія пранікліі ў друк, а таксама позніх рэдактарскіх паправак. Выверка — літара за літарай, фраза за фразай. Так звераны з арыгіналам тры вялікія творы Талстога — яго раманы.

— А з чаго пачалася ваша сувязь з Талстым?

— Гэта было ў 1918 годзе, — успамінае Уладзімір Аляксандравіч. — Я, тады яшчэ зусім малады чалавек, прыняў удзел у складанні плана выдання поўнага Збору твораў пісьменніка. Вывучэнне рукапісаў і архіўных дакументаў вылілася тады ў першую аўтарскую работу «Любоў у жыцці Льва Талстога». Потым падрыхтаваў да публікацыі сем тамоў пісьмаў у Зборы твораў. Гэта быў подступ да творчай гісторыі твораў вялікага мастака слова.

А жанр мне падказаў яго родапачынальнік Н. К. Піксанаў. Першай з такіх кніг стала «Творчая гісторыя «Анны Карэнінай». Праз некалькі гадоў была апублікавана работа, прысвечаная раману «Уваскрэсенне». Летась выйшаў з друку том, які адлюстраваў гісторыю твораў, напісаных Талстым за 20 гадоў паміж гэтымі двума раманамі. Сюды ўвайшлі аповесці і апавяданні «Крэйцарава саната», «Смерць Івана Ільіча», «Айцец Сергій» і іншыя, п'есы «Улада цемры» і «Плады асветы».

— Колькі ж гадоў пайшло ў вас на гэту работу?

— Арыфметыка простая: з 1918 па 1968 год — 50 гадоў. Але вынікаў яшчэ не падводжу. Толькі што закончыў яшчэ адну кнігу. У ёй — агляд творчасці Талстога за апошнія дзесяць гадоў жыцця — гісторыя стварэння мастацкіх твораў, якія адносяцца да гэтага перыяду.

— А дзе скрыжаваліся вашы шляхі з Уладзімірам Аляксандравічам?— пытаюся ў Эвеліны Яфімаўны.

— У музеі пісьменніка. Талстой, можна сказаць, і «павянчаў» нас. Я пачала з «Работы Талстога над партрэтам Кацюшы Маславай». У канчатковай рэдакцыі, калі памятаеце, гэта ўсяго чатырнаццаць радкоў. Але перапрацоўваў іх пісьменнік дваццаць разоў. Аналіз усіх варыянтаў выявіў цікавую карціну, у якой відочна і ярка паўстае Талстой-мастак у яго «творчай лабараторыі».

— Якую са сваіх работ вы лічыце галоўнай?

— «Вайна і мір» Л. М. Талстога. Стварэнне вялікай кнігі». Над ёй я працавала каля дзесяці гадоў.

— А ці нельга прыадчыніць вашу «творчую лабараторыю»?

— Калі гаварыць вельмі спрошчана, метад работы зводзіцца да таго, што старанна разбіраю рукапісы, усе варыянты ў паслядоўнасці напісання твора. Гэта дае магчымасць прасачыць галоўную лінію творчых шуканняў мастака, выявіць шляхі, якімі ён ішоў да мэты.

Іменна такім спосабам мне ўдалося паказаць сапраўдную задуму Талстога, які пісаў гістарычную эпапею, а не сямейную хроніку, як сцвярджалі некаторыя літаратуразнаўцы. Пры аналізе рукапісу стала зразумела, што Талстой з самага пачатку задумаў «Гісторыю з 12-га года», якая паступова разраслася ў эпапею «Вайны і міру», што ахапіла рускую гісторыю з 1805 па 1820 год. Над ёй і працаваў пісьменнік сем гадоў «з пакутлівай і радаснай упартасцю і хваляваннем».

— Цікава адзначыць, — гаворыць Эвеліна Яфімаўна, — што ў працэсе работы над рукапісам эпапеі выяўлена і выпраўлена каля дзвюх тысяч памылак, дапушчаных перапісчыкамі, наборшчыкамі, а таксама вольных рэдактарскіх паправак, якія пранікліі ў друкаваны тэкст твора.

Муж і жонка В. А. Жданаў і Э. Е. Зайдэншпур напісалі сцэнарый навукова-папулярнага фільма, які расказвае аб рукапісах Талстога. Яны поўныя творчых планаў. «У рабоце» зараз — «Талстой у перапісцы родных і блізкіх», а Эвеліну Яфімаўну цікавяць яшчэ і міжнародныя сувязі вялікага мастака.

П. КАСАЛАПАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

СПРАВАЗДАЧНЫ КАНЦЭРТ КАПЭЛЫ

У Магілёве добра ведаюць выступленні народнай харавой капэлы, лаўрэата Усесаюзнага фестывалю мастацкай самадзейнасці, якой кіруе выкладчык кафедры музыкі педагагічнага інстытута В. Башко.

З кожным годам расце майстэрства капэлы. Яе заслужана называюць флагманам харавога самадзейнага мастацтва Магілёўшчыны.

Днямі ў актавай зале дашкольнага педагагічнага вучылішча адбыўся справаздачны канцэрт калектыву. У першым аддзяленні капэла выканала песні савецкіх кампазітараў, апрацоўкі рускіх, беларускіх і ўкраінскіх народных песень. Гледачы цёпла прынялі народную песню ў апрацоўцы Новікава «Эй, вухнем!».

У другім аддзяленні канцэрта капэла з поспехам спявала «Партызанскія акопы» Р. Пукста, «Беларусь, мая песня» Ю. Семянякі, «Анчар» А. Арэнскага, «Неапалітанскую тарантэлу» Расіні і інш.

Зараз капэла развучвае спецыяльна напісаную для яе паэму-рэквіем Ю. Семянякі «Хатынскія званы».

У гэтыя дні самадзейны калектыў рыхтуецца да паездкі ў Эстонію, дзе прыме ўдзел у свяце песні.

Д. ЗАКАШАНСКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

20 мая

Першая праграма 9.10 — тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 10-ы клас. «Агляд сучаснай беларускай драматургіі». 10.00 — навіны (М). 10.15 — «Маршрутамі пяцігодкі». Перадача з Кіева. 10.45 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Умелыя рукі» (М). 17.00 — праграма перадач. 17.05 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Пра што расказалі чараўнікі». Спектакль Кіеўскага тэатра лялек. 18.15 — ленінскі універсітэт мільёнаў. Палітэканомія сацыялізма. «Уклад У. І. Леніна ў развіццё эканамічнай навукі» (М). 18.45 — «Панарама навін». 19.00 — закрыццё X занальнага агляду кіна- і тэлефільмаў Латвіі, Літвы, Эстоніі, Малдавіі і Беларусі. 20.00 — «Майстры мастацтваў». Народны артыст БССР Г. Ю. Грыгоніс. Да 80-годдзя з дня нараджэння. 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — кінапанарама (М). 22.45 — «На велагонцы Міру». Перадача з ГДР (у запісе) (М). 23.00 — «Веснік АДН». Праграма перадач.

Другая праграма 16.45 — навіны (М). 17.00 — для школьнікаў. «Жаваранак». Перадача з Кішынёва. 17.30 — «Аб'ектыў». Тэлевізійны клуб кіна- і фотаматараў. Перадача з Таліна 18.15 — у свеце мастацтваў». «Спявае І. Пятроў». «Пушкін у Каменцы». Кінанарысы. 18.45 — «Яўгенія Грандэ». Тэлевізійны мастацкі фільм (М). 20.30 — «Метамарфозы». Фільм-канцэрт. 21.00 — экран — завочнікам. «Фізіка».

21 мая

Першая праграма. 9.10 — тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 10-ы клас. «Па сцежках Максіма Багдановіча». 9.40 — «У баях за рабочы Урал». Кінанарыс. 10.00 — навіны (М). 10.15 — да Дзён балгарскай культуры ў СССР. Для школьнікаў. П. Панчаў. «Казка пра чатырох блізнят». Спектакль Калінінградскага драматычнага тэатра. Перадача з Калінінграда. 16.35 — праграма перадач. 16.40 — школьная фільматэка. «Лёс чалавека». Мастацкі фільм. 18.30 — па ленінскіх мясцінах. Перадача з Ленінграда. 19.00 — для выпускнікоў сярэдніх школ. «Уперадзе экзамены». Кансультацыя па геаметрыі і трыганаметрыі. 19.20 — «Панарама навін». 20.00 — «Навука, эканоміка, практыка». Тэлевізійная сельскагаспадарчая школа. «Механізацыя вырошчвання льну». 20.35 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — «Віч божы». Мастацкі фільм. 22.30 — на першынство свету па шахматах. Дзённік (М). 22.45 — «Хроніка музычнага жыцця рэспублікі. Год 1968-ы». 23.30 — «На велагонцы Міру». Перадача з ГДР (у запісе) (М). 23.45 — «Навіны. Каментарыі». Праграма перадач.

Другая праграма 17.00 — навіны (М). 17.15 — «Наш дэпутат». Тэленарыс (М). 17.45 — для школьнікаў. «Вось і сталі мы на год сталей». Перадача з Рыгі. 18.30 — дзіцячы экран. «Каласок». Лялечны фільм. 19.00 — «Узарванае пекла». Мастацкі фільм (М). 20.35 — экран — завочнікам. «Вышэйшая матэматыка». 21.15 — праграма каляровага тэлебачання. Перадача з Кіева. 22.45 — «Музыка сёння» (М).

22 мая

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — навіны (М). 17.15 — для малодшых школьнікаў. «Расказы пра Леніна» (М). 17.45 — «Эканоміка і тэхнічны прагрэс» (М). 18.15 — канцэрт лаўрэата Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва народнага ансамбля танца «Лявоніха» Палаца культуры Мінскага трактарнага завода (М). 19.00 — «Еўрапейскі турнір юнёраў па футболу. СССР — Румынія. Перадача з ГДР. У перапынку — навіны (М). Пасля заканчэння — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21.15 — «Ленінская эстафета». Перадача другая». «Саюз сярпа і молата». 21.45 — да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Калі дарагі табе твой дом». Мастацка-публіцыстычны фільм.

Другая праграма. 19.30 — вечар-канцэрт, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння народнага артыста БССР кампазітара М. Чуркіна. 21.15 — праграма каляровага тэлебачання «Маці». Мастацкі фільм (М). 22.55 — «На велагонцы Міру». Перадача з ГДР (у запісе) (М). 23.10 — «Навіны. Каментарыі». Праграма перадач. 23.20 — экран — завочнікам «Фізіка».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. А. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры, выкладчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-21-53, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 08687